Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

[illegible]АРУ 5 кап.

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

10 год выданьня

АДРАС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не зварочваюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:	
На 1 месяц	90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародняя	20 к.
мясцовыя	10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:	
За радок пanпарэлі пасьля тэксту	— р. 50 к.
За радок пanпарэлі наперад тэксту	1 р. — к.
За радок пanпарэлі перад тэкстам	1 р. 50 к.

Сьпешныя на 50 проц. даражэй

Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:	
За 1 дакумэнт	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумэнт	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, упаўнаважанымі газэты і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА

№ 275 (2764) Аўторак, 3-га сьнежня 1929 г.

ПАСТАНОВА

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

аб адкладзе перавыбару саветаў БССР.

Прымаючы пад увагу хадайніцьвані шэрагу акруг, саветаў, грамадзкіх арганізацый і на падставе пастановы Прэзыдыуму ЦВК Саюзу ССР ад 23-га лістапада 1929 году, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

У скасаваньне пастановы Прэзыдыуму ЦВК БССР ад 27 кастрычніка 1929 г. „аб правядзеньні перавыбараў саветаў і раённых зьездаў саветаў БССР у 1930 г." („Савецкая Беларусь" за 29 кастрычніка 1929 г., № 248) — перавыбары саветаў БССР адкласьці.

СТАРШЫНЯ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БССР **А. Чарвякоў.**

САКРАТАР ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БССР **А. Хацкевіч.**

30-га лістапада 1929 г.
гор. Менск.

Выканаем плян лесазагатовак

Пашыраныя тэмпы будаўніцтва, нашы экспартныя пляны вымагаюць чоткай і своечасова разгорнутай кампаніі лесазагатовак. Між тым, Лесбелам дагэтуль яшчэ не разгорнута належным чынам лесазагатоўчая праца, галоўным чынам, з-за недахопу рабочай сілы, а Наркамзем яшчэ ня скончыў здачы лесасек. Наркампрацы ў свой час заключыў з Лесбелам умову па забясьпечаньню лесазагатовак рабочай сілай, але мясцовыя органы НКП амаль нічога рэальнага не зрабілі для выкананьня ўзятых на сябе абавязацельстваў. Дагэтуль на лесазагатоўках работае замест 34000 чалавек толькі 14000.

На ходзе лесазагатовак адбіваецца і далёка нездавальняючае забясьпечаньне рабочых харчовымі прадуктамі. Лесасындыкат ня выканаў свае абавязацельствы па забясьпечаньню лесазагатовак інструмантамі і трактарамі. Досыць сказаць, што пакуль атрымана толькі 3500 піл замест запатрабаваных 10000, а трактароў зусім няма.

Ня лепш стаіць справа і з загатоўкай дроў. Нават плян 1928-29 году выканан усяго на 60 проц. Пяцігадовы плян бягучага гаспадарчага году па дровазагатоўках значна павялічан, што было выклікана напружаным становішчам забясьпечаньня апалам прамысловасьці і гарадоў. Да 15 лістапада гадавы плян загатовак дроў выканан толькі на 14 проц., а квартальны—на 32 проц. і па вывазцы выканана ўсяго 4,5 проц. гадавога заданьня. Тут таксама адчуваецца значны недахоп у рабочай сіле, інструмантах і харчовым забясьпечаньні рабочых.

Для зьнішчэньня ўсіх недахопаў і недарэчнасьцяў у галіне загатовак лесу і дроў, ВСНГБел. запрапанаваў Лесбелу неадкладна мабілізаваць увесь свой апарат. Лесбел павінен прыняць самыя рашучыя меры да неадкладнага разгортваньня лесазагатовак. Набходна зараз-жа ўкамплектаваць поўнасьцю загатоўчы апарат тэхнічнымі і адказнымі працаўнікамі. Белсельтрэст і Белкалгассаюз павінны забясьпечыць трактарамі лесазагатоўкі Лесбелу, бо гэта апрача матар'яльнай карысьці як саўгасам, так і калгасам нічога ня дасьць, а справе лесазагатавак акажа вялікую дапамогу. Апрача таго саўгасы і калгасы павінны даць свой рабочы-гужавы транспарт для вывазкі лесаматар'ялаў і дроў.

Лесбел на мясцох лесагатовак павінен практыкаваць правядзеньне вытворчых нарад, уцягваючы ў іх шырокія масы лесасекаў. На нарадах павінны абгаварвацца пытаньні ўзмацненьня тэмпу лесазагатовак, палепшаньня іх якасьці і зьніжэньне сабекошту. Ніводная прапанова вытворчых нарад не павінна застацца не ажыцьцяўлёнай.

Трэба забраніраваць за Лесбелам усю рабочую сілу на мясцох. Наркампрацы павінен неадкладна заняцца арганізацыяй сталых арцеляў з батрацкабедняцка-серадняцкіх мас вёскі для лесазагатовак. Нар. Кам. Гандлю павінен зараз-жа прыняць рашучыя захады да поўнага задавальненьня па ўстаноўленых нормах харчаваньня прадуктамі і прамтаварамі батракоў, беднякоў і серадняком, якія працуюць на лесазагатоўках.

Акруговыя выканаўчыя камітэты павінны зьвярнуць максімум увагі справе загатовак лесаматар'ялаў і дроў, яны павінны вылучыць сваіх упаўнаважаных па лесазагатоўках і ўскласьці на іх адказнасьць за пасьпяховае выкананьне загатоўчых плянаў.

Задачы загатовак лесаматар'ялаў і дроў вельмі важныя і адказныя. Лесбелу без дапамогі партыйных і грамадзкіх арганізацый, а таксама без дапамогі ўсёй савецкай грамадзкасьці будзе цяжка справіцца з пастаўленымі перад ім задачамі. Партыйныя арганізацыі павінны належным чынам скарыстаць энэргію і энтузыязм грамадзкасьці і працоўнага сялянства, якія былі праяўлены апошнімі ў хлеба і бульбазагатоўках, на справу выкананьня лесазагатоўчых плянаў.

Лесазагатоўкі павінны ўстаць у цэнтры ўвагі партыйных і грамадзкіх арганізацый і пры іх дапамозе, а таксама пры дапамозе батрацтва і беднякоў-серадняцкіх мас вёскі, плян загатовак будаўнічых і экспартных лесаматар'ялаў і дроў павінен быць выканан у тэрмін і поўнасьцю.

НА ДРУГОЙ СЭСІІ ЦВК СССР У СКЛІКУ

З КІТАЙСКІМ НАРОДАМ САВЕЦКІ САЮЗ БЫЎ І ЁСЬЦЬ У ДРУЖБЕ

ДАЛЁКА-УСХОДНЯЯ БЫЛА ПРЫМУШАНА УЖЫЦЬ МІНІМУМ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ НА КІТАЙСКАЙ ТЭРЫТОРЫІ ДЛЯ ЛІКВІДАЦЫІ ГНЁЗД, АДКУЛЬ РАБІЛІСЯ ЎЗБРОЕНЫЯ НАЛЁТЫ НА НАШУ ТЭРЫТОРЫЮ І АБСТРЭЛ НАШАЙ МЯЖЫ.

З ДАКЛАДУ тав. РЫКАВА.

Падаць унутраную палітыку нашай дзяржавы і кантрольныя лічбы на наступны год адарвана ад пытаньняў міжнароднай палітыкі—нельга. Мы з вамі будуем сацыялістычную грамаду ва ўмовах капіталістычнага абкружэньня.

У галіне замежнай палітыкі я спыню вашу ўвагу толькі на двух-трох асабліва вострых, актуальных пытаньнях нашага міжнароднага становішча. З пункту гледжаньня барацьбы за мір найбольшую трывогу выклікаюць падзеі, што адбываюцца на нашай усходня-кітайскай мяжы. Мы маем там востры канфлікт, які, нажаль, вельмі зацягваецца. Захоп УК чыгункі, гвалты над савецкімі грамадзянамі на тэрыторыі Кітаю, ліквідацыя дзейнасьці нашага Далёка-Ўсходняга банку выразна гаварылі аб тым, што мы ў даным выпадку маем справу з правакацыяй вайны. Справа ў тым, што кожная дзяржава, апроч нашай, на такія ўчынкі кітайскага ўраду неадкладна адказала-б ваеннымі апэрацыямі. Я ні ў якой меры ня хочу і не магу абвінавачваць у гэтых правакацыйных дзеяньнях кітайскі народ. Кітайскі народ быў і застаецца адною з прыгнечаных імпэрыялізмам нацый і, вядомая рэч, ня ў інтарэсах кітайскага народу быць зброяй у руках імпэрыялістаў для барацьбы з Савецкім Саюзам. Кітайскі народ да гэтага часу праводзіць барацьбу за сваё нацыянальнае і сацыяльнае вызваленьне. Але асаблівая іронія гісторыі выяўляецца ў тым што ў даным выпадку ўрад гэтага прыгнечанага народу быў застрэльшчыкам ваеннай правакацыі і зброяй у руках імпэрыялістаў супроць СССР. Гэты факт паказвае, наколькі ўмела імпэрыялістычныя сілы выкарыстоўваюць усе магчымасьці ў барацьбе супроць нас.

За апошні час мы прымушаны былі на кітайскай тэрыторыі ажыцьцёвіць некаторыя ваенныя апэрацыі. Я павінен на сэсіі ЦВК СССР з усёй катэгарычнасьцю заявіць, што ўсе нашы дзеяньні на мяжы з Кітаем, у тым ліку і апошнія ваенныя апэрацыі,—усё гэта ні ў якой меры не супярэчыць той мірнай палітыцы ў адносінах да Кітаю, якую мы праводзім.

Апошнія нашы дзеяньні былі вымушаны тым, што кітайскі ўрад, не абмяжоўваючыся захопам УК чыгункі, разгромам нашых устаноў на тэрыторыі Кітаю, зьдзекам над нашымі грамадзянамі,—праз увесь час згрупоўваў сваё войска на мяжы з нашым Саюзам, сыстэматычна арганізоўваў пераход белагвардзейскіх банд і асобных ваенных атрадаў праз нашу мяжу. Ня толькі нашы парубежныя часьці, але і наша мірнае насельніцтва ўздоўж мяжы знаходзілася ўвесь час пад абстрэлам. Як пасьля захопу УК чыгункі, так і на працягу доўгага пэрыяду перад гэтым захопам мы выказвалі зусім выключную цярплівасьць у адносінах да ўсіх гвалтаў, якія на тэрыторыі Кітаю чыніліся над нашымі ўстановамі і над нашымі грамадзянамі. Нагласьць ворага і разьмер яго правакацый праз увесь час узрасталі. Вось чаму армія Блюхера праз свае асобныя атрады была прымушана ажыцьцёвіць неабходны мінімум мераприёмстваў на кітайскай тэрыторыі для ліквідацыі тых гнёздаў, адкуль рабіліся ўзброеныя налёты на нашу тэрыторыю і абстрэл нашай мяжы.

Я павінен заявіць з поўнаю катэгарычнасьцю, што ніякіх мэтаў, апроч абаронных, гэтыя дзеяньні ня мелі, што мы ня імкнуліся і ня імкнемся да захопу хоць аднаго мэтра кітайскай тэрыторыі. На гэтыя дзеяньні мы былі змушаны выключнай сыстэмай правакацый, арганізаванай па той бок мяжы.

Вы ведаеце з газэт, што гэтымі днямі мы атрымалі ад мукдэнскага ўраду згоду мірна вырашыць канфлікт на аснове тых прапаноў, якія мы ўвесь час высоўвалі, г. зн. аднаўленьне на УК чыгунцы становішча згодна заключанага ў Пекіне і Мукдэне ў 1924 г. дагавору і неадкладнае назначэньне згодна гэтых дагавораў нашага кіраўніка чыгункаю і яго памоцніка. Гэта гаворыць за тое, што вырашэньне савецка-кітайскага канфлікту можа быць дасягнута ў бліжэйшы час. Я гавару—можа быць дасягнута—і баюся выказаць гэта больш рашучымі словамі, бо гэткія-ж прапановы мы мелі і раней, але кожны раз яны па розных прычынах браліся назад і тым самым мірнае ўпарадкаваньне канфлікту з нанкінскім урадам зрывалася.

Вопыт мінулага часу, як і сучасны момант паказваюць, што адначасна з ростам шансаў на скончэньне мірных перамоў між намі і Кітаем—у загранічным друку пачыналася агітацыя супроць СССР і падаваліся розныя весткі аб закулісных перамовах між дзяржавамі аб пасрэдніцтве. Сыстэматычна і заўсёды гэтыя два моманты звычайна супадалі. Я не памятую, каб які-небудзь з чужаземных урадаў паспрабаваў умяшацца ў той пэрыяд, калі кітайская ўлада захапляла УК чыгунку, каб перашкодзіць гэтаму захопу. Але шмат хто з іх не адмовіцца ўмяшацца зараз, каб пад прыкрыцьцём дапамогі захопнікам пажывіцца самому.

Нядаўна ў загранічным друку ізноў зьмешчаны былі артыкулы аб тым, што ідуць пагалоскі аб пасрэдніцтве паміж намі і Кітаем. Гэта значыць, што ізноў хочуць зацягнуць канфлікт і сарваць мірныя перамовы. Ніякага пасрэдніцтва ў перамовах між намі і Кітаем мы не дапусьцім.

Гаворачы аб апошніх падзеях на УК чыгунцы, я не магу ня спыніцца на тым факце, што на ўпартасьць кітайскага ўраду, вядомая рэч, не магло зрабіць уплыву непасрэднае азнаямленьне кітайскай ваеншчыны з магутнасьцю нашай арміі. Чырвоная армія малявалася заграніцаю як небаяздольная. У апошніх, ня так ужо і вялікіх, апэрацыях яна нагэтулькі ярка паказала перавагу савецкай зброі, што кожны Чан-Кай-Шы павінен пераканацца ў тым, што калі мы не ваюем з Кітаем, дык зусім не затым, што ня можам ваяваць, а затым, што ня хочам ваяваць (працяжныя бурныя воплескі). Апроч таго, увесь замежны друк прымушан зараз прызнаць, што наша армія выказала зусім выключную арганізаванасьць, выключную вытрыманасьць і выключна-прыхільныя адносіны да ўсяго мірнага насельніцтва Кітаю, з якім ёй даводзілася стыкацца ў часе апошніх апэрацый.

Другі фронт нашых адносін з капіталістычнымі дзяржавамі яшчэ зусім нядаўна быў зьвязаны са спробаю кансэрватыўнага ангельскага ўраду заснаваць супроць нас блёк буржуазных дзяржаў. Я ня буду аналізаваць праграмы новага ўраду, яна мала чым адрозьніваецца ад старой. Аднак, урад Макданальда прызнаў, што Англія зацікаўлена аднаўленьнем нармальных дыплёматычных зносін з намі. Зазначыўшы, што прамысловая Англія праз сваю спэцыяльную дэлегацыю наведала летась наш Саюз, і тады т. Пятакоў інфармаваў гэтую дэлегацыю аб тых магчымасьцях разьвіцьця эканамічных адносін, якія зьвязаны з ажыцьцяўленьнем пяцігадовага пляну, Рыкаў адзначае, што гэтыя магчымасьці вырасьлі яшчэ больш, бо пяцігадовы плян ажыцьцяўляецца ў значна больш кароткія тэрміны, чымся мы меркавалі самі пры яго складаньні.

Буржуазныя газэты з году ў год пішуць аб тым, што ва ўсім капіталістычным сьвеце ўсё добра, а ў Савецкім Саюзе ўсё дрэнна, і вось на працягу 12 гадоў штогоду яны прарочаць крызіс гаспадаркі нашай краіны. Як гэта ня дзіўна, з гэтым прароцтвам мы маем справу і сёлета, калі капіталістычная гаспадарка перажывае вострыя цяжкасьці.

Біржавы крызіс Злучаных Штатаў, які выбухнуў на амэрыканскай біржы, адбіўся на становішчы буржуазнай гаспадаркі амаль што ва ўсіх капіталістычных краінах. Мы маем дзьве зусім процілеглыя, зусім рознага тыпу цяжкасьці. У капіталістычных краінах цяжкасьці выплываюць з перавытворчасьці, з нездольнасьці эксплёатуемага насельніцтва набываць тавары. Цяжкасьці нашага разьвіцьця выплываюць з недастатковасьці росту індустрыі, з недастатковасьці росту вытворчасьці і немагчымасьці для нас у кароткі час здаволіць патрабаваньні нашага рынку.

Перашоўшы да пытаньня аб нашай канцэсійнай палітыцы Рыкаў зазначае, што ў сувязі з ростам нашай дзяржаўнай прамысловасьці і разьмер канцэсійнай прадукцыі складае вельмі значную частку ўсёй нашай прадукцыі. Я не хачу, кажа Рыкаў, ні ў якой меры ўтойваць і таго, што частка канцэнсіянэраў ліквідавала свае прадпрыемствы ў нашай краіне. Мы ня лічым сябе ні ў якой ступені вінаватымі ў ліквідацыі іх. Мы згодны даваць канцэсіі і надалей, але пры ўмовее каб яны працавалі на свае грошы, а не на нашы. Нашай канцэсійнай палітыкай мы хочам прыцягнуць канцэсійныя капіталы, а не капіталістаў, як прыемных для нас людзей. Капіталісты, як гэткія, нам зусім непатрэбны (воплескі). Калі да нас прыяжджаюць капіталісты і хочуць працаваць на нашы грошы, дык мы ім адказваем, што гэта зусім ня тое, што нам патрэбна, а наадварот (сьмех). Канцэсія ў нашай краіне, гэта зусім не канцэсія ў краіне каленіяльнай, г. зн. канцэсіянэры ня могуць, як рабочыя кажуць,—„рабаваць". І разьмерам прыбыткаў канцэнсіянэраў і вывазам гэтых прыбыткаў заграніцу і валюце павінны быць нейкія межы. Усе ўдзельнікі канцэсійных прадпрыемстваў ні ў якой ступені не павінны грунтаванца на ілюзіях, што прыватныя ўласьнікі ізноў вернуцца ў СССР, на ілюзіях магчымасьці аднаўленьня ў нас капіталізму. Яны не павінны таксама сваімі паводзінамі даваць магчымасьці папракаць іх з гэтага боку. Каротка: працуй на свае грошы, не рабуй і не займайся контр-рэвалюцыяй—вось умовы для канцэсіянэраў.

У СССР

Вітаюць ЦК УсеКП(б).

МАСКВА, 30-XI. ЦК УсеКП(б) атрымаў прывітальную тэлеграму ад рабочых, інжынэраў і тэхнікаў Днепрастану. Посьпехі, дасягнутыя на Днепрастане, зазначана ў прывітаньні, які зьяўляецца аднэю з самых вялікіх пабудоў сусьветнай тэхнікі, сьведчаць, што генэральная лінія партыі на шпарчэйшую індустрыялізацыю краіны і перабудову сельскай гаспадаркі бязумоўна правільная і што апартуністычныя прароцтвы правых ухілістаў аб немагчымасьці ажыцьцявіць намечаныя тэмпы будаўніцтва зьяўляюцца беспадстаўнай гаворкай.

Назначэньне т. т. Асінскага, Томскага і інш.

МАСКВА, 2-12. Пастановаю ЦВК і СНК СССР т. Асінскі і т. Томскі назначаны намесьнікамі старшынаў ВСНГ СССР. Акулаў назначан намесьнікам НК РСІ СССР. Сакольнікаў вызвалены ад абавязкаў старшыні праўленьня Нафтасындыкату з прычыны назначэньня яго паўнамоцным прадстаўніком у Лёндан. Тав. Ломаў і Сямён Шварц назначаны ў прэзыдыум ВСНГ СССР.

850,7 мільёнаў рублёў.

МАСКВА, 1-12. Згодна апошняга падсумаваньня саюзнага Паркамфіну агульная сума падпіскі на 3 пазыку індустрыялізацыі па ўсім СССР дасягнула 850,7 мільёнаў рублёў.

У ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ

УЗБУРАНЫЯ ПРАВАКАЦЫЯЙ, СЯЛЯНЕ ЗЬБІЛІ ПАЛІЦЫЮ.

ВІЛЬНЯ, 1-12. „Кур'ер Віленскі" паведамляе, што ў мястэчку Кнышына, Беластоцкай акругі, фашысцкі пасол Сав'цкі з дазволу ўраду сабраў мітынг пад адкрытым небам. Калі ён ужо скончыў сваю прамову, дык на гэтым самым месцы хацеў працягваць мітынг пасол Лось (пяставец з кулацкай партыі). Аднак, прадстаўнік староства яму не дазволіў гэтага і абвясьціў мітынг зачыненым. Калі-ж натоўп не падначаліўся гэтаму загаду, дык прадстаўнік староства загадаў паліцыі разагнаць людзей гвалтам.

Як толькі паліцыя прынялася за выкананьне гэтага загаду,—раптам быў зроблен з натоўпу выстрал у кірунку паліцыі (ніхто паранены ня быў). Узбураны натоўп каля 600 чалавек кінуўся на паліцыю і пачаў яе біць, пры гэтым 5 паліцыянтаў былі моцна зьбіты. Паліцыя адстрэліваючыся адступала, аж да часу прыбыцьця паліцэйскага рэзэрву з Беластоку.

* *
*

Так паведамляе аб здарэньні ў Кнышыне „Кур'ер Віленскі", ад якога нельга спадзявацца аб'ектыўнага высьвятленьня гэтага здарэньня.

Гэты факт заслугоўвае вялікай увагі. Ён характарызуе, наколькі абвостраны адносіны і якая лютая ненавісьць пануе сярод шырокіх працоўных мас да фашысцкага ўраду і яго паліцэйскага апарату. Нельга занадзорыць фашысцкіх паслоў у „падбухторваньні" мас супроць існуючага ладу; наадварот, яны агітавалі за фашысцкую дыктатуру. Але працоўныя масы не паддаюцца на кручок фашысцкіх агітатараў і працоўныя масы ведаюць, што толькі ў рашучай барацьбе з фашысцкай дыктатурай пад кіраўніцтвам пралетарыяту і яго авангарду—кампартыі, ляжыць парука перамогі.

Напад фашысцкай баёўкі на камуністычных дэпутатаў у Львове.

ВАРШАВА, 2-12. «Газэта Польска» паведамляе аб нападзе „рабочых" на камдэпутатаў Сыпулу і Гаўрона, якія былі запрошаны беспрацоўнымі рабочымі на мітынг. Мітынг меў адбыцца каля будынку «бюро пасрэдніцтва працы». На гэты мітынг сабралася некалькі сотняў беспрацоўных, якія пачалі абгаварваць сваё жудаснае становішча і шляхі, як направіць свой лёс.

Калі на мітынг прышлі камдэпутаты, дык беспрацоўныя рабочыя спаткалі іх з вялікім уздымам. У часе прамовы камдэпутата Сыпулы падышла вялікая група „беспрацоўных" фашыстаў, якая накінулася на камдэпутатаў і пачала іх зьбіваць. Беспрацоўныя рабочыя рынуліся на абарону пасло ў і напэўна сурова расправіліся-б з кучкай фашысцкіх бандытаў, каб не падасьпела пешая і конная паліцыя, якая абараніла фашысцкую баёўку, разагнала мітынг беспрацоўных.

Узмоцненая паліцэйская варта прымусіла камдэпутатаў пайсьці на вакзал.

Абнаглеўшы фашызм ужывае ўсе мэтады тэрору ў адносінах да рэвалюцыйных рабочых і яшчэ больш жорсткі тэрор у адносінах да іх правадыроў.

На зьездзе кампартыі Англіі

ЛІДС, 30-XI. Зьезд ангельскай кампартыі заслухаў прывітаньні ад кампартый: Галяндыі, Баўгарыі, Югаславіі і Румыніі. Асноўная палітычная рэзалюцыя, якая прапанавана зьезду, датыкаецца пытаньняў міжнароднага становішча, небясьпекі вайны, унутрыпартыйнага становішча і задач партыі.

Падаўшы асноўную рэзалюцыю Гары Політ заявіў, што падзеі апошняга часу з поўнай дакладнасьцю пацьвердзілі правільнасьць ацэнкі, дадзенай трэцяму пэрыяду пасьляваеннага крызісу капіталізму 10-м пленумам Выканкому Камінтэрну.

Політ падкрэсьліў у сваім дакладзе значэньне трыумфу пяцігодкі ў СССР і магутнай хвалі рэвалюцыйнага сацыялістычнага спаборніцтва, якія, будучы выяўленьнем узрастаючай сілы сусьветнага пралетарыяту, зьяўляюцца разам з тым самай сур'ёзнай пагрозай капіталізму. Партыя павінна шырока растлумачыць шырокім масам значэньне пяцігодкі ў СССР і міжнароднага сацыялістычнага спаборніцтва.

Барацьба супроць ваеннай небясьпекі павінна быць цэнтральнай задачай партыі, якая павінна выкрываць імпэрыялістычныя манэўры лейбарыстаў і мабілізаваць сілы на абарону СССР.

Політ даў агляд палітычных і эканамічных боек пралетарыяту ва ўсім сьвеце і падкрэсьліў, што гэтыя бойкі адбываліся разам з узмоцненай барацьбою супроць правай небясьпекі ва ўсіх партыях. Політ адобрыў захады, ужытыя Камінтэрнам супроць правых і прымірэнцаў у кампартыях СССР, Чэхаславакіі, Нямеччыны, Францыі, Швэдыі, Злучаных Штатаў і ў самой Англіі.

Політ зазначыў, што галоўныя задачы партыі—у масавай палітычнай кампаніі супроць лейбарысцкага ўраду, ва ўзмацненьні працы ў калёніях, у палітычнай кампаніі за адчыненьне штодзённай камуністычнай газэты, у пашырэньні працы, у галіне перабудовы партыі на аснове фабрычна-заводзкіх ячэек. Нарэшце, барацьба супроць правай небясьпекі павінна адбывацца, не зважаючы на асабістыя прыяцельскія ці варожыя адносіны, але выключна на прынцыповай палітычнай аснове.

На барацьбу за Савецкую Нямеччыну

БЭРЛІН, 1-XII. З заключным словам на зьездзе рэвалюцыйнай прафсаюзнай апазіцыі выступіў тав. Мэркер, які зазначыў, што апазіцыйныя прафсаюзы, выключаныя з рэфармісцкіх прафарганізацый, або адышоўшыя ад іх, павінны сябе разглядаць, як частку прафсаюзнай апазіцыі, інакш яны няўхільна будуць ізноў скатвацца да рэфармізму.

Прафсаюзная апазіцыя разьвівае ў сучасны момант наступ. Рэфармісцкія лідэры ўсенямецкага аб'яднаньня прафсаюзаў пераканаюцца па справе, чаго яны дамогуцца, калі паспрабуюць выканаць сваю пагрозу выключыць з аб'яднаньня 759 дэлегатаў зьезду, якія ўваходзяць ва ўсенямецкае аб'яднаньне.

У сувязі з абмежаваным часам тав. Мэркер закрануў толькі ў рамках заключнага слова другое пытаньне, якое стаяла на парадку дня—аб падрыхтоўцы да 5-га кангрэсу Прафінтэрну. Ён зазначыў, што для ажыцьцяўленьня пастаноў зьезду прафсаюзнай апазіцыі ў чарговым месяцы будзе паладжана шэраг акруговых канфэрэнцый апазіцыйных прафсаюзаў і нарад прадстаўнікоў фабрычна-заводзкіх прадпрыемстваў з мэтаю арганізаваць кіраўніцтва надыходзячымі эканамічнымі бойкамі і абраць дэлегатаў на 5-ты кангрэс Прафінтэрну.

Пад уражаньнем працы зьезду 40 беспартыйных дэлегатаў, у тым ліку шмат нядаўна ўступіўшых у сацыял-дэмакратычную партыю, заявілі аб залічэньні іх у шэрагі кампартыі.

Зьезд паслаў гарачую прывітальную тэлеграму выканаўчаму бюро Прафінтэрну. Зачыняючы зьезд т. Борц ад імя абранага ўсенямецкага камітэту заверыў дэлегатаў зьезду, што камітэт пад кіраўніцтвам КП Нямеччыны, Камінтэрну і Прафінтэрну павядзе нямецкіх працоўных на барацьбу супроць сацыял-фашысцкай прафбюракратыі, прадпрыемцаў, дзяржаўнага апарату; супроць пляну Юнга і за савецкую Нямеччыну.

Ніякага пасрэдніцтва між СССР і Кітаем.

КІТАЙСКІЯ ГРАМІЛЫ АБІВАЮЦЬ ПАРОГІ У СВАІХ ГАСПАДАРОЎ. ІМПЭРЫЯЛІСТЫ ЎСЁ ЯШЧЭ МАРАЦЬ АБ УМЯШАЦЕЛЬСТВЕ У САВЕЦКА-КІТАЙСКІ КАНФЛІКТ.

Паведамленьне ТАСС.

30 лістапада на прыгранічны пункт Гродзекава прыехаў дыплёматычны камісар у Харбіне Цай-Юн-Шэн разам з сябром праўленьня УК чыгункі Лі-Шао-Гунам і паведаміў, што ў сувязі са згодаю маршала Чжан-Сюэ-Ляна на ўсе прапановы савецкага ўраду, ён жадае спаткацца з агентам Народнага Камісарыяту па Замежных Справах т. Сіманоўскім для абмеркаваньня працэдуры выкананьня 2-га пункту памянутых прапаноў.

Цай-Юн-Шэн і Лі-Шао-Гун былі прапушчаны ў горад Нікольск-Усурыйск, куды для спатканьня з імі выехаў з Хабараўску т. Сіманоўскі.

Каб утрымаць дысцыпліну—растрэльваюць

ТОКІЁ, 1-12. Водлуг атрыманых тут вестак, камандуючы манчжурскім войскам Ван-Фу расстраляў больш за тысячу салдат за адмову падначаліцца загадам камандаваньня. Штаб арміі эвакуаваўся з Бухеду, разрабаванага кітайскімі войскамі.

Прыехаўшыя з Хайлару паведамляюць, што мост праз рэчку Аргунь і чыгуначнае дэпо былі зруйнаваны па ініцыятыве супрацоўніка апаратыўнага аддзелу кітайскага штабу расейскага белагвардзейца Іванова.

Ажыўленьне ў эканамічных колах і перапуд белагвардзейцаў.

ТОКІЁ, 1-12. З Харбіну паведамляюць, што весткі аб абмене нотамі паміж мукдэнскім і савецкім урадамі выклікала там вялікае ажыўленьне ў эканамічных колах. Курс кітайскага даляру павялічыўся. У бела-эміграцкіх колах і ў кіраўніцтве УК чыгункі паведамленьне аб згодзе Мукдэну на савецкія патрабаваньні выклікала перапуд.

Разбураюць чыгунку.

ХАБАРАЎСК, 1-12. Адступаючае белакітайскае войска руйнуе маемасьць УК чыгункі. Падарван мост праз рэчку Імінгол, на станцыі Цаган падарвана вадакачка і папсавана частка чыгункі. Шэраг зруйнаваньняў учынен на ст. Халхантэ і інш.

Ліга Нацый зьвернецца з „пратэстам".

ТОКІЁ, 1-12. Водлуг паведамленьня агенцтва Сімбун-Рэнго з Нанкіну, таварыш міністра замежных спраў Нанкінскага ўраду Чан-Во-Хуа заявіў, што згодна вестак ад кітайскіх пасланьнікаў, на працягу 10 дзён Ліга Нацый, а таксама дзяржавы, якія падпісалі пакт Келёга, зьвернуцца з пратэстам на савецкага ўраду, „што будзе мець сур'ёзныя вынікі".

У жаночай вопратцы.

ТОКІЁ, 2-12. З прычыны дэмаралізацыі кітайскага войска, на заходняй лініі УК чыгункі, у Хайлары і Бухеду заснаваліся атрады самаабароны. У Харбіне наглядаліся выпадкі гуляньня салдат у накрадзеных жаночых паліто. Улада распачала разбройваць некаторыя часьці Харбінскага гарнізону.

„Ніцы Ніцы" аб савецка-кітайскім канфлікце.

ТОКІЁ, 1-12. Японская газэта «Ніцы-Ніцы», якая выходзіць у Харбіне, абмяркоўваючы зварот мукдэнскага ўраду да СССР, піша: „Даволі цяпер самага малога ўдару, або нават проста запужваньня з боку чырвоных, каб па ўсёй Паўночнай Манчжурыі пракацілася хваля непарадкаў у выглядзе поўнай дэмаралізацыі кітайскага войска.

Нанкінскі ўрад заўкрае ўвесь сьвет у сваёй міралюбнасьці, але ў кітайскай арміі няма міралюбнасьці ў адносінах да ўласнага народу. Неабходна ўпарадкаваць канфлікт у самы кароткі тэрмін".

Стымсон усё яшчэ „мяркуе".

НЬЮ-ЁРК, 1-12. Дзяржаўны сэкратар Стымсон заявіў, што ён намеран прадаўжаць перамовы з дыплёматычнымі прадстаўнікамі Японіі, Англіі і Нямеччыны аб становішчы савецка-кітайскага канфлікту, хоць Злучаныя Штаты не прапанавалі дзяржавам якога-небудзь поўнага пляну дзеяньняў.

Колькі каштуе Чан-Кай-Шы „замірэньне" з Фынь-Юй-Сянам.

ПЭЙПІН, 30-11. Як паведамляе „Пэйпін Вань-Бао", войска Гамінцьзюну, так званая народная армія, адступіла затым, што Фынь-Юй-Сян атрымаў ад Нанкіну 10 мільёнаў даляраў; апроч таго, Чан-Кай-Шы абяцаў склікаць у Цяньцзіне канфэрэнцыю кіруючых кітайскіх дзеячоў пасьля прыдушэньня паўстаньня на поўдні.

Водлуг слоў газэты гэты кампраміс будзе дасягнуты праз Ен-Сі-Шана.

Канфіскацыя беларускага календара на 1930 г.

ВІЛЬНЯ, 2-12. Па загаду гарадзкога Віленскага старосты канфіскован беларускі каляндар на 1930 год, які быў выдадзены Таварыствам Беларускай Школы.

* *
*

Жорсткі фашысцкі тэрор зусім задушыў беларускую рабоча-сялянскую прэсу. Сотні канфіскацый газэт, арыштаў і штрафаў рэдактароў нават за перадрук, хоць гэта раней было дазволена цэнзурай. Усе самыя нячуваныя мэтады тэрору ўжывае фашызм, каб не дапусьціць ні жывога ні друкаванага слова праўды ў беларускія працоўныя масы.

Разам з гэтым польскі фашызм адкрывае шырокае поле дзейнасьці для беларускіх нацыянал-фашыстаў. Гэтымі днямі была адчынена беларускай фашысцкай арганізацыяй—Інстытутам гаспадаркі і культуры „беларуская" бібліятэка-чытальня. Гэтая чытальня адчынена з той мэтай, каб з аднаго боку падтрымаць ілюзіі, што і пры польскім фашызме „беларуская культура» можа разьвівацца, а з другога —каб праз гэтую «беларускую бібліятэку-чытальню» агенты польскага фашызму правадзілі працу, якая патрэбна польскім фашыстам. Гэтая праца бязумоўна зьвязана ў першую чаргу з падрыхтоўкаю да ваеннага нападу на СССР у сэнсе стварэньня спрыяючай думкі сярод беларускага працоўнага сялянства.

Але дарэмныя натугі польскага і беларускага фашызму. Расьце класавая сьвядомасьць у шырокіх масах працоўных і яны ня пойдуць ні за польскімі ні за беларускімі фашыстамі, якую-б вопратку яны не надзявалі. Працоўныя добра разумеюць іх класавую сутнасьць.

Кангрэс індыйскіх прафсаюзаў.

ЛЕНДАН, 1-12. У Нагпуры адчынілася сёньня сэсія індыйскага кангрэсу прафсаюзаў. Старшынствуе Джавахарлал Нэру. Памяшканьне, дзе адбываецца кангрэс, прыбрана плякатамі з надпісамі «няхай жыве рэвалюцыя», «памятайце пра сваіх таварышоў у Міруце» і г. д.

Перад адчыненьнем пасяджэньня выканком кангрэсу ўхваліў большасьцю 53-х галасоў супроць 41-го рэзалюцыю, у якой выказваецца за абсалютны байкот камісіі Уіклі, якая абмяркоўвае ўмовы працы індыйскіх рабочых. Пры адчыненьні сэсіі Джавахарлал Нэру сказаў прамову, у якой катэгарычна патрабаваў байкоту Уіклі. Нэру востра крытыкаваў урад лебарыстаў, заявіўшы, што ён зьяўляецца ў такой-жа ступені імпэрыялісцкім і нацыяналісцкім, як і ўрад Балдвіна. Згодна прапановы Нэру кангрэс ухваліў не далучацца ні да Амстэрдаму ні да Прафінтэрну.

На кангрэсе здарыўся раскол па пытаньні, ці належыць кангрэсу далучыцца да Ціхаакіянскага сэкратарыяту. Чаман Лал і Фаткула-Хан адлучыліся і наладзілі сход для распрацоўкі пляну заснаваньня новай арганізацыі пад лёзунгам „легальныя прафсаюзы, вольныя ад маскоўскага ўплыву".

Менская канфэрэнцыя ўдарных брыгад.

ВЫНІКІ МАСАВАЙ ПРАВЕРКІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА.

(З дакладу тав. Розіна).

Вынікі праверкі і выкананьня дагавору па сацыялістычнаму спаборніцтву лішні раз сьцьвярджаюць, што сацыялістычнае спаборніцтва поўнасьцю сябе апраўдала, як новы мэтад працы, як лепшы мэтад камуністычнага выхаваньня рабочых мас.

Пэрыяд сацыялістычнага спаборніцтва даў нам ня толькі значны рост прадукцыі на фабрыках і заводах, на нашым чыгуначным транспарце, у нашых саўгасах, але ў пэрыяд сацыялістычнага спаборніцтва ў значнай ступені выпраўлены ўсе тыя недахопы па якасных паказчыках, якія мы мелі за першае паўгодзьдзе 1928-29 году.

Правільнае кіраўніцтва партыі, той гераізм, які выяўляўся і выяўляецца зараз асноўнай масай рабочай клясы, даў нам магчымасьць забясьпечыць выкананьне прамфінпляну на галоўных вучастках нашага будаўніцтва, а па некаторых мы маем ня толькі выкананьне, але нават і перавышэньне.

На працягу на 1½—2 мес. мы, кажа т. Розін, разам з вамі правялі масавую праверку сацыялістычнага спаборніцтва. На 24 прадпрыемствах і 9 саўгасах было вылучана 104 рабочых брыгады, у якія было ўцягнута 812 рабочых. Масавасьць у гэтай працы бачна і з таго, што на гэтых прадпрыемствах праведзена 189 сходаў, нарад і канфэрэнцый, у якіх прымала ўдзел больш 12000 чалавек.

Праверка дапамагла нам выявіць сапраўднае становішча сацыялістычнага спаборніцтва, яка дала магчымасьць больш завастрыць увагу шырокіх мас рабочых на сутнасьці і задачах сацыялістычнага спаборніцтва. Праверка высьветліла цэлы шэраг дасягненьняў і разам з тым шэраг буйных недахопаў.

Масавая праверка выявіла уздым і энтузіязм рабочых, якія ў пэрыяд сацыялістычнага спаборніцтва вылiліся ў розныя формы. Тав. Розін зазначае, што прагулы бяз уважлівых прычын значна зьменшыліся, а па некаторых прадпрыемствах даведзены нават да нуля. Мы былі сьведкамі дабраахвотнага зьніжэньня расцэнак, павялічэньня норм выработкі. Напрыклад, на заводзе „Бальшавік“ 202 рабочых зьнізілі расцэнкі, што дае эканоміі 179 руб. у месяц. На Менскай абутковай фабрыцы ёсьць шэраг выпадкаў адмаўленьня ад аплаты за прастоі, ад аплаты за перарабленьне браку.

Большасьць прафарганізацый кіравала сацыялістычным спаборніцтвам кампанейскім парадкам. Большасьць матар'ялаў рабочых брыгад гавораць аб тым, што сацыялістычнае спаборніцтва не займала належнага месца ў працы фабзавкомаў, што ўсе віды і формы масавай прафсаюзнай працы ня былі падпарадкаваны асноўным задачам сацыялістычнага спаборніцтва. Такія сводкі можна прывесьці па цэламу шэрагу заводаў. Сводка заводу „Красная Заря“ гаворыць, што сацыялістычнае спаборніцтва праходзіла стыхійна, без кіраўніцтва з боку завкомаў і вытворчай камісіі. Вытворчая камісія гэтага заводу за 6 месяцаў наладзіла толькі адно насьледжаньне па пытаньнях сацыялістычнага спаборніцтва. Такі малюнак назіраўся на шэрагу іншых фабрык і заводаў.

У культмасавай працы, за некаторымі выключэньнямі, сацыялістычнае спаборніцтва не находзіць належнага адбітку. Далей т. Розін спыняецца на тым, што побач з вялікім энтузіязмам, які выяўляецца асноўнай масай рабочых, маюцца адсталыя і рвацкія настроі, асабліва новых кадраў рабочых. Бяда ў тым, што ні прафарганізацыі і гаспадарчыя органы, ні асобныя прафактывісты, ні асобныя партыйцы і камсамольцы ня здолелі ў дастатковай ступені рэагаваць на гэтыя рвацкія настроі.

Тав. Розін спыняецца на росьце ўдарных брыгад. Праверка паказала, што колькасьць ударных брыгад павялічваецца з кожным днём. Да праверкі было 22 брыгады, а цяпер налічваецца ўжо 96. Ёсьць выпадкі, калі асобныя цэхі абвяшчаюць сябе ўдарнымі,—абвясьціў сябе ўдарным хлебазавод. На фабрыцы „Чырвоная Бярэзіна“—479 ударнікаў, або 40 процантаў агульнай колькасьці рабочых, на „Домбалі“—357 ударнікаў—35 пр. агульнага ліку рабочых, на «Меншвэі» да масавай праверкі брыгад ня было, а зараз там ёсьць 296 ударнікаў, на шчотачнай фабрыцы да праверкі было 3 брыгады, а зараз маецца 7 з 140 ударнікамі і г. д.

У выніках работы брыгад, якія былі арганізаваны некалькі месяцаў назад, мы маем досыць рэальныя дасягненьні. На „Чырвонай Бярэзіне“ група ўдарнікаў вырабатала ў маі на 3,9 проц. больш, чым няўдарнікі, у чэрвені на 7,2, у ліпені на 11,6 проц. больш чым іншыя рабочыя і г. д. Такія-ж прыклады можна прывесьці і па шэрагу іншых прадпрыемстваў, але ёсьць маленькае «але». Трэба прывесьці ўмовы, у якіх прыходзілася працаваць ударнікам.

Нашы прафсаюзныя арганізацыі не кіравалі работай ударнікаў, не кіравалі работай ударных брыгад. З боку гаспадарчых органаў таксама не аказывалася належная дапамога ў рабоце ўдарнікаў. Дзякуючы пасыўным адносінам з боку прафарганізацый, дзякуючы няўважлівым адносінам некаторых партыйных ячэек і асобных гаспадарнікаў, некаторыя брыгады распадаліся. Так было на заводзе „Дрэваапрацовачнік“. На заводзе „Камунар“ група рвачоў з некаторымі партыйцамі займалася цкаваньнем ударнікаў, віхто з-за заводзкіх арганізацый ня прыняў захадаў да спыненьня гэтай агіднай недарэчнасьці і ўтварэньня для ударнікаў адпаведных умоў.

Прафарганізацыі павінны пакончыць з пасыўнымі адносінамі да работы ударных брыгад, павінны утварыць належныя ўмовы для іх гераічнай работы, павінны вопыт ударных брыгад шырока папулярызаваць сярод рабочых мас.

У заключэньне тов. Розін зазначае, што слаба ўцягнуты ў сацыялістычнае спаборніцтва тэхнічныя сілы, адміністрацыйны пэрсанал, слаба выкарыстоўваюцца фонды прэміраваньня, а ёсьць фабрыкі, дзе гэтых фондаў зусім няма. На такім буйным заводзе, як «Домбаль», фонд складаецца усяго з 39 рублёў. Трэба і тут дабіцца рашучага пералому ў станоўчы бок.

СПРЭЧКІ ПА ДАКЛАДУ тав. РОЗІНА.

РАБОТНІЦА НА ДАПАМОГУ СПАБОРНІЦТВА.

Тав. **Крэмер**. Работніцы ва ўдарных брыгадах сябе поўнасьцю апраўдалі. Сярод нашых рабочых, а таксама і працаўнікоў некаторых арганізацый наглядаюцца моманты няўважлівых, а часта і насьмешлівых адносін да актыўнасьці і ініцыятывы работніц. Нашым ударным брыгадам на гэта трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу.

РАШУЧА ЗМАГАЦЦА З ПЕРАШКОДАМІ У СПАБОРНІЦТВЕ.

Тав. **Штэйнэр**. Нашымі прафсаюзнымі і грамадзкімі арганізацыямі недастаткова праведзена растлумачальная праца па сацыялістычнаму спаборніцтву. Здараліся выпадкі, калі сацыялістычнае спаборніцтва разумелася рабочымі, як зьніжэньне зарплаты, вынікам чаго былі такія выпадкі, што некаторыя рабочыя прыходзілі да адміністрацыі і добраахвотна зьніжалі расцэнкі з тым, каб пры сацыялістычным спаборніцтве ім ня зьнізілі расцэнкі яшчэ больш. Часта ўдарныя брыгады ня ведаюць свайго месца на вытворчасьці.

Сацыялістычнае спаборніцтва павінна пайсьці ня толькі па шляху павялічэньня колькасьці вырабу, але, галоўным чынам, па палепшаньні якасьці вырабу. Дагаворамі па сацыялістычнаму спаборніцтву шмат яшчэ чаго не ахоплена. З боку нізавых гаспадарчых органаў па прадпрыемствах сацспаборніцтву адводзіцца мала ўвагі. Ёсьць выпадкі перашкоды спаборніцтва. Такі выпадак меў месца на абутковай фабрыцы, дзе група рабочых арганізавала сапраўдны сабатаж. Праўда, сабатаж быў хутка выяўлен самімі-ж рабочымі.

Такія выпадкі патрабуюць ад нашых арганізацый значна большай увагі да сацыялістычнага спаборніцтва.

УЦЯГНУЦЬ ТЭХСІЛУ Ў ВЫТВОРЧЫЯ НАРАДЫ.

Ісаеў (рабочы-чыгуначнік). Лёзунг сацспаборніцтва сустрэлі жывы водгук з боку рабочай масы, але ў кіраўніцтве гэтым энтузіязмам ня было дастатковай увагі. Нашы сацдагаворы мала мелі канкрэтнага. Пры праверцы выкананьня гэтых дагавораў—паказальнікі выкананьня часта браліся „с потолка“. Гаспадарнікі няўважліва, а часта бюракратычна, адносіліся да сацспаборніцтва. Гэта сьцьвярджаецца хоцьбы тым фактам, што і зараз гаспадарнікі ня выказваюцца ў спрэчках. Здараліся выпадкі няўвязак паміж сацдагаворамі і пастановамі адміністрацыі. Мала зьвяртаецца ўвагі з боку вышэйшага інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу на рабочае вынаходзтва. Інжынэры мала наведваюць вытворчыя нарады.

ІНЖЫНЭРНА-ТЭХНІЧНЫ ПЭРСАНАЛ ДАПАМОЖА.

Тав. **Марголін** (інжынэр). Выпадкі няўважлівых, бюракратычных адносін з боку інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу да справы сацыялістычнага спаборніцтва маюцца, але яны заўважваюцца з боку асобных спэцыялістаў і масавага характару ня маюць. Асноўная маса спэцыялістаў гатова аддаць усе свае веды на справу сацыялістычнага спаборніцтва, яна вядзе барацьбу супроць шкодніцтва, бюракратызму і нядбайнасьці сярод сваіх шэрагаў. Асноўная маса „спэцыялістаў ідзе па аднаму шляху з рабочай клясай. Мы павінны аддаць усе свае веды па справу сацыялістычнага будаўніцтва. Тэорыя плюс практыка, веды плюс энтузіязм дадуць моцны грунт для сацыялістычнага спаборніцтва.

Тав. **Экельчык** (зав. „Дрэваапрацовачнік“). Мала вядзецца растлумачальная праца сярод ударнікаў, насьценная газэта мала асьвятляе пытаньні сацыялістычнага спаборніцтва. Прапановы па спаборніцтву, якія падаваліся рабочымі праз насьценгазэту рэалізаваліся.

АЧЫСЬЦІЦЦА АД САЦЫЯЛЬНА-ЧУЖОГА ЭЛЕМЭНТУ.

Тав. **Кохан**. (Фабрыка абутку). Нашы клюбы не прыстасаваны да адраджэньня працы па сацспаборніцтву. Замест таго, каб правесьці які-небудзь вечар абмену вопытам па сацспаборніцтву, ці вечар ударных брыгад, нашы клюбы наладжваюць кіно, альбо платны спэктакль, каб здабыць больш сродкаў. Працу клюбаў трэба паставіць так, каб яна адбівала ў сабе ўвесь ход сацспаборніцтва, працу ударных брыгад, каб яна наогул была шчыльна зьвязана з агульнай працай прадпрыёмства. Майстры амаль што ня прымаюць ніякага ўдзелу ва ўдарнай працы. На нашыя заводы часта трапіць сацыяльна-чужы элемэнт, які часта шкодзіць у працы прадпрыёмства. Ударныя брыгады ў зьвязку з гэтым павінны наглядаць за новымі рабочымі. На нашай фабрыцы быў выпадак, калі адно аддзяленьне выпускала ўсяго 100 пар абуткаў у дзень, а калі была зьменена адна работніца, гэтае самае аддзяленьне пачало даваць у дзень 450 пар абутку. Гэты факт сьведчыць праяўленьне сабатажу з боку некаторых рабочых. Ударныя брыгады павінны павесьці рашучую барацьбу з гэткімі зьявішчамі.

НЕКАТОРЫЯ ГАСПАДАРНІКІ ПЕРАШКАДЖАЮЦЬ.

Штэйнгарт. На заводзе «Камінтэрн» (Барысаў), калі адзін рабочы ўнёс прапанову аб сацспаборніцтве, рабочыя называлі яго здраднікам рабочае клясы. На канфэрэнцыю рабочай моладзі, якая праводзілася пры Беллзаржбудзе ніводзін інжынэр не зьявіўся. На чыгунцы, калі рабочыя арганізавалі ўдарную брыгаду і пайшлі ўзгадняць працу брыгады да гаспадарнікаў, апошнія адказалі, што да таго часу, пакуль мы не атрымаем аб гэтай кампаніі ліст ад т. Куйбышава, мы нічога ня ведаем.

Да ўдарных цэхаў.

Быў верасень месяц, восень, гразка, дождж хлюпае. На вялікім двары заводу «Камунар» будавалася новая вялікая кузьня. На другім баку двара ляжалі аграмадныя жалезныя калёны, а каля іх працавала брыгада з 20 здаровых шыракаплечых рабочых. Клёпка калён дзеля новай кузьні ішла поўным крокам.

—Давай заклёпку... давай яшчэ адну,—крычалі таму, хто награваў заклёпкі. Апошні-ж хутка хапаў у жалезныя гарачыя абцугі беланакалёную заклёпку і апранаў у дзірку. Адразу дзьве вялікія цяжкія кувадлы кляпалі, білі па абжымцы і праз 5 хвілін красавалася ўжо круглая бліскучая заклёпка. Работы падыходзілі да канца, нават і пагода не дазваляла працаваць. Трэба было пераходзіць у цэх. На заводзе ўжо гаварылі аб ударніках, пісалі аб гэтым у газэтах.

Група ініцыятараў камсамольцаў паставіла сваёй мэтай арганізаваць ударную брыгаду.

Даёш, хлапцы... пішы мяне,—крыкнуў Мікіцін,—мяне...

Ільлін,
Гардзей
Кацэвіч,
Залатарэвіч

усе як адзін запісалася і абяцалі быць ударнікамі, не рабіць прагулаў... спазьненьняў... уздымаць вытворчасьць.

Так нарадзілася адна з пятнаццаці брыгад Менскага мэталёвага заводу «Камунар». У сучасны момант мы налічваем амаль што ў кожным цэху брыгады... па дзьве, тры, чатыры. Ёсьць нават і ў ліцейным цэху. Адна зьмена кузьні абвясьціла сябе ўдарнай. Строгальшчыкі, такары—усе мы ўдарнікі.

Гэтымі днямі ў нас адбудзецца нарада ўсіх ударнікаў, дзе мы выпрацуем свой статут і далейшыя шляхі нашай працы.

Да падыходзячага зьезду ударнікаў мы прапануем, каб канфэрэнцыя вызначыла далейшыя шляхі, каб было зьвернута больш увагі з боку нашых гаспадарнікаў, каб усяляк садзейнічаць, даваць больш матар'ялаў, каб ня было перапынку ў працы.

Хутка скончыцца пабудова новай магутнай кузьні. Гэта кузьня будзе ўдарнай. Ударным хутка будзе і ўвесь „Камунар“.

Камсамольскі калектыў „Камунару“, які атрымаў сьцяг ад Ф. Р. і ад ВСНГ моцна трымае яго ў сваіх руках і з гонарам ідзе ўпарта наперад да вытворчых перамог.

Так ад паасобных ударнікаў, ад паасобных брыгад мы ідзём да цэхаў ударнікаў. Гэткая сапраўдная пралетарская самадзейнасьць людзей, якія будуюць і пабудуюць сацыялізм.

Артур Ляхавецкі
(ударнік заводу „Камунар“).

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Пушчана новая фабрыка.

(Па тэлефону ад нашага карэспандэнта).

БАРЫСАЎ, 2-XII. Сёньня, а 4 гадзіне дню пушчана нова-пабудаваная сярніковая фабрыка. Фабрыка будзе працаваць да 1 лютага аднэй зьменай, з 1 лютага у 2 зьмены, а з 1-III у тры. Фабрыка будзе выпускаць каля 3000 скрынак сярнічак у дзень.

На фабрыцэ ўведзен 7-гадзінны рабочы дзень і бесперапынны тыдзень.

НЕДЛІН.

Кулак ухіляецца ад падатку.

(Самахвалавіцкі р., Меншчына).

У Строчыцкім сельсавеце былы гандлярскі сынок Часнок, які прытуліўся каля сваёй цеткі-абшарніцы Акуліч Зосі, зараз жыве на былым сядзібе і лічыць гэта пасёлкам Багатырава. Яны маюць фальшывы надзел з цёткаю, акрамя гэтага адны і тыя едакі запісаны на дзьве гаспадаркі, фактычна-ж у Часнака ёсьць тры едакі, а Акуліч — адна. Яшчэ ёсьць нейкі Русецкі Домінік, які работаў у якасьці парабка, але здаецца, што пішуць і яго ў едакі. Калі ўсе намянёныя пішуцца ў едакі, дык усяго ёсьць пяць, а ў іх запісана на дзьве гаспадаркі дзевяць едакоў.

На гаспадарцы трымаюць наёмных працоўных сэзонна. Сёлета, каб ня лічыць падзённых на жніва нанята была жнярка.

Папярэджаны Часнок работнікам РВК Аляксейчыкам ужо робіць печ у хаце з другога канца дому, чым мяркуе замаскіраваць фальшывасьць свайго падзелу. Часнок і Акуліч павінны быць злучаны ў адну гаспадарку і аблажаны індывідуальным падаткам і зьняты з работы ў малочных таварыствах, дзе яны работаюць. Часнок скажа, што ў яго едакі браты ды сёстры, так яны жывуць у Менску ва ўласным памяшканьні і лічацца ў бацькі на ўтрыманьні.

Яшчэ здаецца, што Часнок зьяўляецца сябрам саюзу Савгандльслужачых, калі ня вычышчаны па праверцы, дык трэба выкінуць.

Вольны.

Трэба своечасова распачаць абмен сартавога насеньня.

У Прапойскім т-ве ў засеку з аўсом трымаюць журавіны.

У вясеньнюю сяўбу 1930 г. мае быць занята ў БССР пад сартавыя культуры да 100.000 гэкт. пасевамі 4-й рэпрадукцыі і да 35.000 гэкт.—3 рэпрадукцыі аўсу, ячменю, бульбы і інш. Ва ўсіх старых калгасах яравая зьмена павінна быць засеяна выключна сартавымі культурамі, увогуле па БССР сартавымі культурамі павінна быць занята да 60 проц усяго пляцу. Дзеля гэтай мэты будзе завезена з РСФСР да 800.000 пуд. аўсу „Победа“, апроч гэтага, да 2-х мільёнаў пуд. сартавога аўсу мае наша с-г. каапэрацыя.

Зараз павінен праводзіцца абмен звычайнага аўсу ва сартавы, але пакуль што на мясцох яшчэ не раскачаліся з гэтымі апэрацыямі.

Тым часам нашы крэдытныя т-вы ня могуць справіцца з задачай захаваньня сартавога насеньня. Няма адпаведных складаў. Бывае яшчэ і так, калі сартовае насеньне проста гноюць. У Прапойскім крэдытным т-ве ў адным засеку ссыпалі сартавы авёс з журавінамі. Пры аглядзе выявілася, што сапрэў значны пласт аўсу.

Усё гэта вымагае ад мясцовых арганізацый больш рашуча праводзіць абмен сартавога насеньня. Па лініі с-г. каапэрацыі пакуль што няма яшчэ належнага пералому ў гэтай справе.

Царква і касьцёл—пад клюбы.

(Раванічы, Чэрвеньскага р.)

Царква і касьцёл у с. Раванічах, ня гледзячы на розьніцу рэлігіі, маюць паміж сабой вялікае падабенства.

Старыя людзі апавядаюць, што царква і касьцёл былі пабудаваны ў адзін час, аднымі майстрамі, з аднолькавага матар'ялу.

Было гэта яшчэ ў час прыгону. Славуты ўладар маёнтку Раванічы аднойчы на паляваньні закатаваў дасьмерці ня то пяць, ня то дзесяць „хлопаў“.

Аб гэтым дробным здарэньні малады пан хутка запамятаў, але пад старасьць, калі ён пачуў цьвіль сьмерці—пан парашыў замаліць свае грахі, ён пабудаваў аднячасова царкву і касьцёл.

Папы і ксяндзы за панскія мілясьці вельмі шчыра маліліся за душу вялікага дабрачынца-ўладара маёнтку, не шкадавалі кадзіла, і як след дурманілі галовы працоўнаму сялянству, што папа трэба слухаць, што поп пастаўлены самым богам.

Як сапраўдныя жандары, стаяла духавенства на абароне інтарэсаў багатага пана. Што бядняк? Бедняку прыгатавана месцы на небе, а тут, на зямлі, няхай шчыра працуе за нішто на панскіх палёх.

Вось характэрны прыклад „боскай“ дзейнасьці духавенства: ксяндзу раваніцкага касьцёлу два хлапчукі на споведзі адкрыліся, што пасьвілі ўвосені на панскай атаве свае коні. У гэты-ж самы дзень праз ксяндза адміністрацыя маёнку даведалася аб учынку хлапцоў і прыцягнула іх да адказнасьці.

Такое лагоднае сужыцельства паміж царквою і касьцёлам працягвалася да Кастрычнікавай рэвалюцыі. Пасьля гэтага блудныя авечкі—насельніцтва—не захацела больш набіваць свае галовы папоўскім дурманам і трымаць на сваім гарбу гэтых дармаедаў. Паступова пачалі пусьцець і царква і касьцёл. Урэшце, боскія дамы засталіся ўцехаю толькі адных бабулек.

Насельніцтва ўжо добра раскусіла сапраўдную дзейнасьць боскіх слуг. Яшчэ ладны час таму назад насельніцтва пастанавіла выселіць з в. Юрдзыка папа-трутня, які вядзе шкодную працу.

Зараз працоўнае сялянства парашыла поўнасьцю выкараніць папоўскі дурман. На агульных сходах насельніцтва пастанавіла зачыніць у Раванічах царкву і касьцёл і абярнуць іх у культ-асьветныя ўстановы. А такія ўстановы зараз патрэбны тут, дзе рух калектывізацыі шпарка разгортваецца.

Прэч рэлігійныя забабоны! З нас павінна ўзяць прыклад усё працоўнае сялянства.

Абернем усе цэрквы, касьцёлы, сінагогі пад клюбы ды інш. культ асьветныя ўстановы!

ПАПРАЎКА.

У „С. Б.“ № 274 па недагляду карэктуры на 1 стар. ў справаздачным артыкуле „Пяцігадовы плян і чарговыя задачы рабочай моладзі“ ў 5-ым абзацы напісана „...ў лепш сьвядомых рабочых будуць зьяўляцца сумненьні...“, а трэба „...ў менш сьвядомых рабочых будуць зьяўляцца сумненьні...“

За поўнае выкананьне пастаўленых партыяй і ўрадам задач.

Рапарт ударных брыгад чыгуначнікаў Менскага вузла МББ.

На Менскім вучастку Маск.-Балт.-Бел. чыгункі першая ўдарная брыгада была арганізавана у лютым г. г. у момант правядзеньня камсамолам прамысловага паходу. Брыгада была арганізавана ў сталярным цэху з моладзі, у яе ўвайшло 6 чалавек.

У санавіку арганізуецца другая брыгада з моладзі з 3 чалавек.

У маі арганізавана 3-я ударная брыгада з моладзі і дарослых рабочых у складзе 10 чалавек.

У час ходу работ ударных брыгад рабочыя поўнасьцю зразумелі і ўцямілі значэньне работы гэтых брыгад. У выніках зараз налічваецца ўжо 32 ударных брыгады з 187 рабочымі.

Ударныя брыгады зьніжаюць расцэнкі на 5,7 і 10 проц.

Вынікам работы ўдарных брыгад мы маем дасягненьні ў галіне падняцьця актыўнасьці і ініцыятывы рабочых мас у справе работы на вытворчасьці.

За IV квартал замест 20 вагонаў з рамонту выпушчана 22 вагоны. Зьніжана затрата чалавека-гадзін на адзінку рамонту вагонаў з 1200 да 989 чалавека-гадзін.

Скарочан прастой вагонаў у рамонце з 22 да 17 дзён.

Зьнішан сабекошт рамонту па аднаму вагону на 33 руб. 96 кап.

Гадавое заданьне па рамонту вагонаў выканана поўнасьцю, прастой вагонаў у рамонце зьніжан з 8 да 6,8 дзён.

Па маламу рамонту заданьне выканана з правышэньнем: заданьне 387, а выпушчана 394 вагоны.

Па бягучаму рамонту пасажырскіх вагонаў было заданьне 2612500 осе-кіл., фактычна выканана 342183 осе-кіл. Зьніжан расход чалавеха-гадзін, зьніжан сабекошт рамонту з 40 да 35 руб. 29 кап.

Па бягучаму рамонту таварных вагонаў замест заданьня ў 2777500 осе-кіл выканана 6131180 осе-кіл., зьніжан расход рабочай сілы і сабекошт рамонту.

Па службе шляху на зьмене шпал из галоўных шляхах павялічылі прадукцыйнасьць працы і зьнізілі сабекошт. Тое-ж па маламу і сярэдняму рамонту шляхаў.

Па службе эксплёатацыі зварот рабочага вагону ў сутках доведзен замест заданьня НКШ і З 2,5 да 2,42. Тое-ж і ў другіх галінах гэтай службы.

Эканамічны эфэкт ад правядзеньня сацспаборніцтва па вучастку—21994 р. 77 к. У гэту суму не ўваходзіць эканамічны эфэкт па службе руху.

Працоўная дысцыпліна значна падымаецца, прагулы зьніжаюцца.

Ударныя брыгады Менскага вучастку супольна з усімі рабочымі і служачымі ставяць перад сабой задачу—хутчэйшае выкананьне 5-цігодкі, яшчэ большае праяўленьне ініцыятывы і творчасьці рабочых мас у справе вынаходзтва і рацыяналізацыі, поўнае выкананьне пастаўленых партыяй і савецкай уладай перад рабочай клясай задач па будаўніцтву сацыялізму ў нашай краіне.

За суцэльную калектывізацыю ўсіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак Беларусі.

Шпаркі тэмп індустрыялізацыі краіны на аснове ўсё ўзрастаючай творчай энэргіі рабочае клясы, узмацненьне кіруючай ролі буйнай сацыялістычнай прамысловасьці ў разьвіцьці ўсёй народнай гаспадаркі, зьяўляецца базай для шырокага разгортваньня работы па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі. Вынікі калгаснага будаўніцтва за мінулы год, усё ўзрастаючае імкненьне асноўных бядняцка-серадняцкіх мас у калгасы, дае магчымасьць ставіць пытаньне аб скарачэньні тэрмінаў поўнай суцэльнай калектывізацыі ўсіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак Беларусі і ажыцьцяўленьня гэтай задачы на працягу бліжэйшых гадоў.

У друку ўжо абвешчана пастанова аб вылучэньні Магілеўскае акругі і 9 раёнаў астатніх акруг БССР для суцэльнай калектывізацыі. Ужо разгорнутая праца па суцэльнай калектывізацыі 9 раёнаў да вясновае пасеўнае кампаніі ўсёй Магілеўскай акругі да канца 1930 году кладзе пачатак выкананьню задачы калектывізацыі ў найбольш кароткі тэрмін усіх бядняцка-серадняцкі гаспадарак Беларусі.

Абагуліць толькі па 25 раёнам, вылучаным для суцэльнай калектывізацыі, 2.930.300 гэктараў зямельнай плошчы, з насельніцтвам у 1 мільён чалавек—задача надзвычайна вялікая і адказная, якая пастаўлена прад усёй Магілеўскай партарганізацыяй і перад усімі 9 раёнамі і ў сваю чаргу акруговымі парыйнымі арганізацыямі.

Аб рэальнасьці гэтае задачы гаворыць фактар усё ўзрастаючай творчай энэргіі і самадзейнасьці батрацтва, беднаты і серадняцкіх мас у барацьбе пад кіраўніцтвам партыі і рабочае клясы за новую вёску. Крок за крокам, перамагаючы шалёнае супраціўленьне кулацтва, пашыраецца сацыялістычны сэктар. Усё больш і больш выціскаюцца і паступова выкарчоўваюцца карэньні капіталізму.

На Беларусі, пры малазямельлі, пры дробнасьці бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, арганізуюцца ўжо калгасы на плошчы ў 25000 гэктар, — гэта лепшае падцьверджаньне таго, што калгасны рух глыбока захапляе працоўныя масы сялянства. Першае мейсца па арганізацыі калгасаў-волатаў заняў **Чэрыкаўскі** раён.

Між тым, было-б абсалютна няправільна пераацэньваць посьпехі, якія ёсьць у нас, ня бачыць недахопаў і недаацэньваць тых складаных вялікіх задач, якія стаяць на шляху калгаснага будаўніцтва перад усімі партыйнымі арганізацыямі і асабліва перад арганізацыямі раёнаў суцэльнае калектывізацыі.

Для таго, каб перамагчы перашкоды і цяжкасьці, каб забясьпечыць выкананьне задачы поўнай 100 проц. калектывізацыі ўсіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, партыйныя арганізацыі Магілеўшчыны, іншых акруг і непасрэдна раёнаў суцэльнае калектывізацыі, павінны ўжо зараз мабілізаваць увагу і ўсе сілы партыйных арганізацый. Неабходна прывесьці ў рух усю пралетарскую грамадзкасьць. Мабілізаваць камсамол, разгарнуць самую шырокую працу растлумачэньня сярод бядняцка-серадняцкіх мас усіх вёсак, у першую чаргу арганізаваць батрацтва і беднату, усямерна ўмацоўваць бядняцка-серадняцкі блёк. Нельга ні на хвіліну забываць, што клясавая барацьба, што супраціўленьне кулацтва дасягае свайго найвышшага пункту. Кулак, падкулачнік, антысавецкі элемэнт будзе выкарыстоўваць усе сродкі, каб сарваць суцэльную калектывізацыю, таму арганізаваць батрацтва і беднату, стала і сыстэматычна весьці работу сярод беднаты і серадняцтва,—зьяўляецца першачарговай задачай.

Трэба з усёй энэргіяй і рашучасьцю зараз-жа прыступіць да практычнай працы. Неабходна на працягу бліжэйшых двух тыдняў усюды правесьці пленумы партыйных камітэтаў, раённыя партсходы для абгаварэньня канкрэтных практычных задач, зьвязаных з правядзеньнем суцэльнай калектывізацыі. Трэба вызначыць канкрэтныя мерапрыемствы, канкрэтныя заданьні для кожнай арганізацыі, для кожнай партыйнай і камсамольскай ячэйкі, для кожнае установы.

Правесьці пашыраныя пленумы сельскіх і раённых саветаў. Паўсямесна разгарнуць работу па правядзеньню сходаў беднаты, узьняць на належную вышыню работу груп беднаты.

Правядзеньне асобнай работы сярод жанчын паставіць у асяродку ўвагі ўсёй падрыхтоўчай працы.

Ня лішнім было-б правесьці ў бліжэйшы час канфэрэнцыі настаўніцтва па пытаньням практычнага ўдзелу і дапамогі правядзеньню суцэльнай калектывізацыі.

Ужо зараз трэба арганізаваць актыў на чале з камуністамі, камсамольцамі і актывістымі вёскі (батрацтва, бедната і серадняки) для практычнай працы па арганізацыі калгасаў, адначасова з гэтым высьвятляць кулацкія гаспадаркі, якія трэба будзе перасяліць на горшыя вучасткі зямлі, якія і адводзяцца для гэтай мэты.

Кожны Райком, кожная парт. і камсамольская ячэйкі павінны пабудаваць пляны, дзе, калі і што трэба рабіць, вызначыць поўных выканаўцаў па кожнаму заданьню.

З боку цэнтральных установаў і арганізацый патрэбна выключная ўвага і дапамога мясцовым арганізацыям раёнаў суцэльнай калектывізацыі.

Усе цэнтральныя ўстановы і арганізацыі, перабудоўваючы наогул пляны і ўсю сваю працу так, каб забясьпечыць сапраўдным кіраўніцтвам рух батрацтва, які шырока разгортваецца і бядняцка-серадняцкіх мас у калгасы, тэрмінова павінны асобна распрацаваць мерапрыемствы па садзейнічаньню і практычнай дапамозе мясцовым арганізацыям раёнаў суцэльнай калектывізацыі.

Калгассаюз, НКЗ і Дзяржплян павінны пабудаваць не пазьней, як да 1 студзеня пляны поўнай калектывізацыі гэтых раёнаў і ўсёй Магілеўскай акругі. Распрацаваць пляны забесьпячэньня і скарыстаньня сельскагаспадарчых машын, прыцягненьня сродкаў самога насельніцтва і максымальнага скарыстаньня працоўнай сілы.

Трэба на аснове вызначэньня памеру разьвіцьця асобных і цэлых груп гаспадарак, вызначыць канкрэтныя пляны, дзе і якія трэба будаваць прадпрыемствы.

Калгассаюзы ўжо зараз павінны арганізаваць у раёнах суцэльнай калектывізацыі курсы для масавай падрыхтоўкі кіраўнікоў калгасаў. Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на падрыхтоўку кадраў па Магілеўскай акрузе.

Каапэрацыйныя цэнтры ў сваю чаргу павінны пераглядзець, што трэба зрабіць па кожнай спэцыяльнай каапэрацыйнай галіне паасобку, бо ў раёнах суцэльнай калектывізацыі па іншаму трэба будзе будаваць сваю працу малочна-жывёлагадоўчаму, паляводнаму і садова-агароднаму саюзу.

Кожная цэнтральная ўстанова павінна дэталёва і яскрава ўявіць сабе, што трэба канкрэтна, практычна зрабіць, каб дапамагчы гэтым раёнам. Асабліва трэба з усёй сур'ёзнасьцю аднесьціся да вырашэньня пытаньня тэлеграфнай сувязі і радыёфікацыі.

Толькі з усёй энэргіяй, старанна ўзяўшыся за працу, уяўляючы цяжкасьці і адказнасьць пастаўленай задачы, мы выканаем першае заданьне і падрыхтуем сябе да выкананьня другой палавіны, яшчэ большае задачы—**ператварыць усю масу бядняцка-серадняцкіх гаспадарак дробных, адсталых, малатаварных—у буйную, калектыўную, усебеларускую якая плянава праводзіць сваю працу, гаспадарку-калектыў.**

500 лепшых рабочых—на работу ў калгасы

Правядзеньне масавай і суцэльнай калектывізацыі патрабуе ад рабочае клясы ўзмоцненага ўплыву, непасрэднага падтрыманьня і садзейнічаньня справе калектывізацыі сельскае гаспадаркі. Неабходна, каб кожнае прадпрыёмства, кожны рабочы ў паасобку, зьявіліся перадавымі барацьбітамі за новую вёску, за далейшае, яшчэ больш рашучае выкарчоўваньне карэньняў капіталізму.

„Мы павінны памятаць, што пакуль прамысловыя рабочыя шчыльна ня возьмуцца за практычнае падтрыманьне справы калектывізацыі вёскі, нічога моцнага, нічога сапраўды надзейнага, нічога сацыялістычнага ў будаўніцтве калгасаў,—калгасаў, якія ахопліваюць сапраўды шырокія бядняцка-серадняцкія масы,—ня будзе“. (Молатаў).

Рабочыя масы ў сапраўднасьці разумеюць тыя вялікія задачы, якія перад імі стаяць у справе забясьпячэньня сваім кіраўніцтвам, вялізарнейшага руху асноўных бядняцка-серадняцкіх мас у калгасы, які мы зараз маем і які ўсё ўзрастае.

Рабочыя калектывы шэрагу прадпрыёмстваў Беларусі па сваёй ініцыятыве ўжо разгарнулі работу па вылучэньню лепшых рабочых на практычную працу ў калгасах. Неабходна гэту работу па вылучэньню рабочых правесьці арганізавана, каб забясьпечыць лепшыя вынікі. Ёсьць ужо вырашэньні належных органаў аб вылучэньні ў першую чаргу 500 чал. камуністых камсамольцаў і беспартыйных рабочых і работніц.

Пасылка 500 лепшых пралетараў, лепшых рабочых і работніц нашых прадпрыёмстваў будзе зьяўляцца вялікай дапамогай калектывізацыі з боку рабочае клясы. Гэта дасьць магчымасьць устанавіць непасрэдную пастаянную сувязь прадпрыёмстваў з калгасамі, саўгасамі і вытворчымі аб'яднаньнямі. Масы калгасьнікаў змогуць пераняць багацейшы вопыт распаўсюджаных ужо такіх мэтадаў працы на прадпрыемствах, як сацыялістычнае спаборніцтва, вытворчыя нарады і г. д. Абавязкова патрэбна, каб з усімі камандыруемымі рабочымі была сталая сыстэматычная сувязь з сваімі прадпрыемствамі (пасылка лістоў, даклады на прадпрыемствах і г. д.) Перад партыйнымі і прафсаюзнымі арганізацыямі высоўваецца адказнейшая задача—стала правесьці работу па мабілізацыі лепшых рабочых. Неабходна ўсе мерапрыемствы, зьвязаныя з вылучэньнем і камандыраваньнем рабочых, увязаць з далейшым ажыўленьнем і палепшаньнем усёй шэфскай працы.

Патрэбна зараз-жа распачаць падрыхтоўчую работу па падбору і вылучэньню рабочых. Шырока растлумачыць задачы рабочае клясы ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Растлумачыць парадак аплаты камандыруемым, парадак падрыхтоўкі іх і г. д.

Кожны камандыруемы таварыш павінен ведаць, што ён камандыруецца ня менш, як на гадовы тэрмін працы, больш таго, пажадана, каб значная частка камандыруемых замацавалася там на сталай працы ў якасьці кіраўнікоў калгасаў, кустовых аб'яднаньняў і г. д.

За кожным камандыруемым павінна забясьпечвацца сярэдняя заработная плата, якая атрымліваецца зараз па данай групе рабочых прадпрыемстваў.

Па звароце камандыруемых на прадпрыемства пасьля гадовай працы, за імі захоўваюцца ранейшае мейсца працы.

Уся праца па вылучэньню рабочых павінна быць скончана да 1 студзеня. З 1 па 15 студзеня павінны праводзіцца акруговыя курсы па азнаямленьню камандыруемых таварышоў з асноўнымі пытаньнямі калгаснага будаўніцтва і агра-граматай.

Да 1 лютага усе 500 чал. павінны быць на мейсцы, каб удзельнічаць ужо ў падрыхтоўцы да вясеньняй пасеўнай кампаніі.

Значная частка камандыруемых таварышоў павінна быць накіравана ў Магілеўскую акругу суцэльнае калектывізацыі.

Партыйныя ячэйкі прадпрыемстваў зараз-жа павінны разгарнуць працу па падрыхтоўцы лепшых кандыдатур з ліку камуністых, камсамольцаў і беспартыйных рабочых і работніц.

Кожная кандыдатура павінна шырока абгаварвацца на сходах ячэек і агульных сходах усяго рабочага колектыву. Трэба падбіраць такіх таварышоў, якія-бы ў сапраўднасьці зьявіліся арганізатарамі і практычнымі памочнікамі ў працы па арганізацыі і будаўніцтву калгасаў і па ўзьняцьцю вытворчасьці працы ў іх.

Калгассаюзы павінны падрыхтаваць і правесьці работу па азнаямленьню камандыруемых рабочых з пытаньнямі калгаснага будаўніцтва, павінны забясьпечыць іх літаратурай і павінны ўжо зараз распачаць працу па падрыхтоўцы масы калгасьнікаў да прыёму рабочых.

Міцькоў.

Пачалася генэральная праверка і чыстка вытворчых ячэек.

Дабіцца максымальнага ўдзелу рабочых у праверцы і чыстцы ячэек ад усяго шкоднага і непатрэбнага і ўвязаць яе з вэрбоўкай і папаўненьнем радоў партыі лепшымі рабочымі і работніцамі.

ПРАВЕРКАЙ ЯЧЭЕК С-Г. АКАДЭМІІ, ПЭДФАКУ БДУ І ГОРАЦКАГА РАБФАКУ ВЫЯЎЛЯЕЦЦА НАЯЎНАСЬЦЬ КЛЯСАВА-ЧУЖЫХ І ВАРОЖЫХ ЛЮДЗЕЙ, ПРЫМІРЭНЦТВА І ПАСЫЎНАСЬЦЬ ДА БАРАЦЬБЫ З ВАРОЖАЙ ПРАЛЕТАРЫЯТУ ІДЭАЛЁГІЯЙ

Ачысьціўшы свае рады, ячэйкі ВНУ яшчэ больш згуртуюцца на барацьбу з усякімі ўхіламі ад ленінскай лініі, згуртуюцца на ажыцьцяўленьне задач сацыялістычнай рэканструкцыі.

Чыстка ячэйкі заводу „Дрэваапрацовачнік".

Падрыхтоўчая праца.

Заводзкая ячэйка ачышчае сябе ад усіх чужых, шкодных і прымазаўшыхся элемэнтаў.

Ячэйка старанна рыхтавалася да чысткі. Яшчэ неяк летам на адчыненым сходзе ячэйкі, з удзелам беспартыйных рабочых, была прапрацавана інструкцыя ЦКК УсеКП аб чыстцы. Для больш шырокага азнаямленьня рабочых з інструкцыяй былі скарыстаны абедзеныя перапынкі. На адчыненым агульным партсходзе ставіўся спэцыяльны даклад аб чыстцы партыі.

Пытаньне чысткі напярэдадні першага сходу разглядалася ў паасобных цэхах. Рэдкалегія выпусьціла спэцыяльны нумар насьценгазэты, які цалкам прысьвечаны пытаньню чысткі.

Зроблена скрынка для матар'ялаў у праверкам. Перад сходам па чыстцы—ячэйка рассылала ўсім рабочым пісьмовыя запрашэньні на сход. Так рыхтавалася ячэйка зав. „Дрэваапрацовачнік" да чысткі.

І вось вынікі. На першы сход, на якім бюро ячэйкі рабіла справаздачу аб сваёй працы, яўка была амаль што стопроцантная.

Апроч партыйцаў і камсамольцаў, на сход зьявілася звыш 140 чалавек беспартыйных—рабочых. Прыходзілі і жонкі рабочых. Досыць вялікі рабочы клюб быў перапоўнены людзьмі.

Пытаньні вытворчасьці ў працы ячэйкі.

Справаздача бюро. Сэкратар ячэйкі тав. Яцкоўскі дае малюнак, у якіх умовах працавала ячэйка. Нашай ячэйцы прыходзілася працаваць у асабліва цяжкіх умовах, умовах перабудовы заводу, арганізацыі і рацыяналізацыі працы ў апошнім у сувязі з пашырэньнем і пераабсталяваньнем заводу. У зьвязку з гэтым галоўнае месца ўвагі бюро ячэйкі займалі пытаньні гаспад. характару, пытаньні арганізацыі працы заводу. У выніку ўсяго гэтага ў працы заводу за апошні год маюцца значныя дасягненьні, з якіх найбольш характэрнымі зьяўляюцца наступныя. Прамфінплян выканан з перавышэньнем на 29 проц., павялічылася прадукцыйнасьць працы па цэхах—на лесапільным цэху на 9,06 проц., па мэблі—на 31,71 пр.; зьнізіўся сабекошт апрацоўкі па лесапільнаму цэху на 8,36 пр., зьменшана колькасьць прагулаў да 0,41 пр. Праведзена значная работа па рацыяналізацыі асобных працэсаў працы (лепш разьмеркавана праца ў зборачным цэху, практычна распачата правільнае ўстанаўленьне расцэнак).

Наогул увесь ход будаўніцтва заводу і шэраг важнейшых мерапрыёмстваў, якія былі праведзены ў сувязі з яго пераабсталяваньнем, праводзіліся пад непасрэдным кіраўніцтвам і актыўным удзеле бюро і ячэйкі.

Ня гледзячы на параўнальна малады, у сэнсе партыйнага стажу, склад ячэйкі (ячэйка налічвае ў сваіх шэрагах 69 членаў партыі і 35 кандыдатаў), ячэйка жвава і свачасова рэагавала на выяўленьне розных антыленінскіх ухілаў і скажэньняў, як наогул у партыі, таксама і сярод паасобных сваіх членаў.

Рост ячэйкі і масавая праца.

У масавай працы ячэйкі былі недахопы. Слабае вывучэньне і пастаноўка працы з беспартыйным актывам, нездавальняючая пастаноўка індывідуальнай і групавой агітацыі ў цэхах, несвоечасовае рэагаваньне на асобныя настроі ў цэхах.

Аднак ня гледзячы на ўсё гэта, рост ячэйкі быў здавальняючы. За мінулы год падана 35 заяў аб уступленьні ў партыю, з якіх ужо прынята 30 чалавек. 21 чалавек, з ліку прынятых у партыю, зьяўляюцца кваліфікаванымі рабочымі і маюць рабочы стаж ад 6 да 33 год.

Цэнтр працы ячэйкі быў перанесен у цэхі, дзе па лініі ячэйкі і фабкому было праведзена шэраг сходаў па розных пытаньнях.

Праца ячэйкі пад абстрэлам мас.

Па дакладу бюро зададзена 99 пытаньняў. У спрэчках выступіла 54 чалавекі. Спрэчкі мелі дзелавы характар. Большасьць спрэчак была накіравана на пытаньне ўдзелу ячэйкі ў агульнай працы заводу. Былі моманты, калі ячэйка занадта перагібала палку ў бок залішняга кіраваньня, залішняга „апякунства", як бы падмяняючы сабой завком, у той час адзначаліся моманты, дзе ячэйка наадварот на паасобныя пытаньні не зварачвала належнай увагі. Напрыклад, ячэйкаю было зроблена шмат памылак у галінах рацыяналізацыі вытворчасьці, уплатненьня рабочага дню, увязкі ў працы паасобных цэхаў, плянавасьці будаўніцтва заводу.

Некаторыя важныя пытаньні ячэйкаю былі праведзены несвоечасова, са спазьненьнем, як, напрыклад, з праведзеньнем сацыялістычнага спаборніцтва ячэйка спазьнілася. Наглядаецца недастатковы ўдзел партыйцаў, а таксама і камсамольцаў у ударных брыгадах. Наогул, на арганізацыю ўдарных брыгад ячэйкай мала зьвернута ўвагі. У сучасны момант на заводзе, які налічвае 310 рабочых, ёсьць усяго 7 ударных брыгад з агульным лікам ударнікаў у 56 чалавек.

У галіне барацьбы з рознымі ўхіламі і скажэньнямі ленінскай лініі партыі, выступаўшыя ў спрэчках таварышы зазначалі, што ячэйка на гэтыя зьявішчы сваечасова і правільна рэагавала.

Праца бюро ячэйкі вялася ня зусім плянава.

Недастаткова праводзілася праца з беспартыйным актывам. Выступіўшы ў спрэчках беспартыйны рабочы тав. Каплан заявіў, што калі-б ячэйка больш старанна праводзіла працу сярод беспартыйнага актыву, дык тыя 35 кандыдатаў, якія ячэйка налічвае на сёньняшні дзень у сваіх шэрагах, ужо былі-б членамі партыі, на іх месцы мелася-б яшчэ столькі новых кандыдатаў.

У пытаньні кіраўніцтва камсамольскай ячэйкай, праца праводзілася дастатковая і камсамольская ячэйка на заводзе мела правільную лінію партыі. Праца камсамольскай ячэйкі была цесна зьвязана з вытворчасьцю і праводзілася пад непасрэдным кіраўніцтвам з боку ячэйкі партыі. Моманты п'янкі, неэтычныя паводзіны праўда наглядаліся за асобнымі камсамольцамі, але масавага характару не насілі.

З працай сярод жанчын справа абстаяла горш. Гэтаму пытаньню з боку ячэйкі ня было аддадзена належнай увагі.

Тое самае можна сказаць і аб працы грамадзкіх арганізацый: МОПР, Шэфтаварыства. Праца гэтых арганізацый праводзілася слаба і належнага кіраўніцтва імі з боку ячэйкі ня было. Выключэньнем зьяўляецца праца ячэйкі ТДА-Авіяхіму і вайсковага гуртка. Мала зьварталася ўвагі з боку ячэйкі пытаньню быту паасобных камуністаў, а таксама і выкананьня асобнымі членамі партыі статуту. За некаторымі членамі партыі ёсьць вялікая запазычанасьць членскіх узносаў. Ёсьць выпадак, калі адным з членаў партыі членскія ўзносы не плаціліся на працягу 14 месяцаў.

Вось у галоўных рысах твар партыйнай ячэйкі заводу „Дрэваапрацовачнік", якая зараз распачынае чыстку сваіх шэрагаў.

Ячэйка Пэдфаку БДУ правярае свае рады.

Чыстка яч. КП(б)Б Пэдфаку распачата некалькі дзён таму назад. Справаздача бюро яч. абгаварвалася каля 4-х дзён. Выказалася 64 чал. студэнтаў. Выказвалася некалькі навуковых працаўнікоў. Беспартыйнае студэнцтва прымае актыўны ўдзел у чыстцы. Выступаючыя таварышы „ня гледзячы на асобы" крытыкавалі ўсю працу парт. арганізацыі на факультэце.

Партыйная арганізацыя факультэту за мінулы навучальны год завастрыла ўвагу на пытаньне выяўленьня клясава-ідэалёгічна чужых ва ўнівэрсытэце.

Выкрыты шэраг студэнтаў, якія захавалі сваё сацыяльнае становішча, пралезьлі на Пэдфак і нават прабавалі атрымаць стыпэндыю. Шмат студэнтаў па паходжаньню сыны нэпманаў, кулакоў і жандараў былі выключаны з унівэрсытэту, частка з прычыны няправільнай палітыкі НКА былі вастаноўлены. Зараз гэтыя студэнты выключаны.

Быў дан належны адпор рэакцыйнай частцы прафэсуры; якая імкнулася прасоўваць ва ўнівэрсытэт антысавецкі погляд па розным пытаньням. (Праф. Васілеўскі, Шчапоцьцяў і інш.) Партыйная арганізацыя ў гэтым годзе зьвярнула ўвагу на прыём студэнтаў на 1-ы курс Пэдфаку, у выніку чаго павялічыўся процант рабочых, батракоў і сялян беднякоў.

Праведзены акадэм. паход у вясну 1929 г. значна палепшыў акадэмпасьпяховасьць.

Разгорнутая самакрытыка, нараўнальна больш, як у мінулым годзе, выявіла цэлы шэраг недахопаў у працы ячэйкі.

Былі выпадкі, калі адзінкі варожа-настроенага беспартыйнага студэнцтва спрабавалі даказаць, што ячэйка ў сваёй працы адмяжавалася ад беспартыйнага студэнцтва, што яч. быццам-бы падзяляла студэнтаў на «мы»—камуністы і „вы"—беспартыйныя, але бліжэйшая да партыі частка беспартыйнага студэнцтва дала рашучы адпор такім выступленьням.

Аб становішчы барацьбы на ідэалёгічным фронце гаварыў т. Трус, які даводзіў, што да запрашэньня навуковых працаўнікоў быў недастаткова ўважлівы падыход, у выніку чаго ў шэраг працаўнікоў БДУ трапілі клясава-чужыя і варожыя нам людзі.

Асабліва небясьпечным зьяўляецца становішча сусэкцыі.

Зараз ужо прыступілі да індывідуальнай праверкі.

В. К.

Вынікі чысткі ячэйкі Рабфаку.

(Горкі, Аршаншчына).

Скончылася чыстка Рабфакаўскай яч. КП(б)Б. Чыстка цягнулася 16 дзён, прайшлі чыстку 83 члены і кандыдаты КП(б)Б. Ячэйка свачасова правяла падрыхтоўку да чысткі. Чыстка выявіла шмат адмоўных бакоў.

Самакрытыка ў ячэйцы не знайшла глебы дзеля свайго разьвіцьця і апошняя была не ў пашане. Загадчык рабфаку член КП(б)Б Хвасьцюк, убачыўшы ў газэце заметку, у якой былі адзначаны недахопы, сказаў: **„Трэба лепш вучыцца, а не пісаць у газэту"**. Шэраг прапаноў, якія былі з боку партыйнай і беспартыйнай масы, не ажыцьцяўляліся. Беспартыйных на рабфаку ячэйка лічыць „ня многа"—43 чал., вось чаму і праца сярод іх не разгорнута, ня ўцягнуты ў палітвучобу, адсюль неразуменьне гаспадарчых цяжкасьцяў, задач чысткі. «Можна было і бяз чысткі выключыць каго патрэбна»,—так гавораць беспартыйныя. Беспартыйныя слаба ўдзельнічалі ў самой чыстцы.

Нездавальняючае кіраўніцтва камсамольскай ячэйкай, нягледзячы на вялікі процант камсамольцаў-партыйцаў. У камсамольскай яч. шмат варожых настрояў, асабліва па сялянскаму пытаньню. Сацспаборніцтва носіць парадны характар; складзены камісіі, выпрацаваны дагаворы, а практычных вынікаў няма. Палітузровень большасьці камуністаў вельмі нязначны, некаторыя не разумеюць розьніцы паміж СПК і ЦВК і г. д.

Недастатковае кіраўніцтва вучэбнай справай, адсюль слабая палітпадрыхтаванасьць канчаючых рабфак. Вучэбныя праграмы патрабуюць перагляду.

Выключаны з шэрагаў партыі 2 чал. Хвасьцюку—сябру КП(б)Б, загадчыку Раб[illegible] дадзена суровая вымова. Асобным партыйцам дадзены розныя партыйныя спагнаньні.

М.

Што выяўлена ў ячэйцы.

(Горкі, с.-г. Акадэмія).

Чыстка ячэйкі КП(б)Б Аграномічнага факультэту, якая цягнецца каля 20 дзён, выявіла поўнасьцю партыйны твар ячэйкі і яе палітычныя памылкі.

Акадэмія, як ВН Установа па с.-г. ня мела ніякага ўплыву на рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, а наадварот яе прафэсары, як Кісьлякоў, далі тэарэтычны падмурак пад праваапартуністычную палітыку Беларускага Наркамзему. На тэрыторыі Горацкага раёну больш хутарскіх гаспадарак, чым ў іншых раёнах (45 проц. ад усёй плошчы).

Ня гледзячы на дырэктывы партыі аб разгортваньні самакрытыкі, парт'ячэйкай і фракцыяй праўленьня нічога ня зроблена, дырэктывы захоўваліся ў партфэлях і габінэтах і не даведзены былі да мас.

Шмат разоў ставілася на фракцыі праўленьня акадэміі, каб зрабіць як мага хутчэй Кісьлякова „прафэсарам", але некалькі разоў, дзякуючы супярэчнасьці радавых партыйцаў, пытаньне не вырашалася. Нарэшце, сабраўшыся з сіламі Кісьлякова зрабілі „прафэсарам". Пытаньне вынесьлі на абгаварэньне агульнага сходу Аграфакаўскай ячэйкі і тут пад націскам фракцыі агульны сход не абсалютнай большасьцю галасоў згадзіўся з пастановаю фракцыі.

Вялікадзяржаўны шавінізм таксама шукаць ня трэба, у час чысткі ён выявіўся з усёй сваёй яскравасьцю. Праф. Хаўке, выступаючы на чыстцы выказаў такую думку: «Для меня не понятно своеобразное белорусское правописание и вообще белорусский язык». Гэтыя словы кажуць, самі за сябе, а ў Акадэміі не адзін такі Хаўке. Парт'ячэйка і фракцыя праўленьня ня мела бальшавіцкай лініі ў такіх пытаньнях, каб даць належны адпор.

Фракцыя з парт'ячэйкай жылі не ў ладах, нягледзячы, што некаторыя члены фракцыі былі членамі бюро ячэйкі. Пастановы бюро фракцыяй у жыцьцё не праводзіліся. Фракцыя рабіла некаторыя пастановы ня лічачыся з думкай партыйцаў. Абслугоўваліся с.-г. акадэміяй індывідуальныя гаспадаркі, на калектывізацыю зьярталася зусім нязначная ўвага.

Чыстка праходзіць актыўна. Трэба спадзявацца, што па сканчэньні апошняй парт'ячэйка стане на новы шлях і ў бліжэйшы час выправіць памылкі.

М.

Чыстка выкрыла разлажэньне

Чым-жа займалася ячэйка КПБ полацкай пошты?.. Такое пытаньне напрашваецца ў выніку праведзенай чысткі ячэйкі КПБ полацкіх паштавікоў.

Ячэйка невялікая—14 чалавек, значная частка кандыдатаў, але з ячэйкі пры чыстцы выключана 5—што складае 36 проц. Гэта адно гаворыць за тое, што ў ячэйцы справы былі ня зусім добрыя.

У ячэйцы больш за ўсё панавала сямейственасьць. Апошняя замяняла сабой унутрыпартыйную дэмакратыю, крытыку і самакрытыку. Ня гледзячы на цэлы шэраг фактаў разлажэньня партыйцаў, хваробных зьявішч, як п'янства, склокі, надсіжваньні, спробы к самагубству,—гэтыя моманты не знаходзілі адпаведнага рэагаваньня з боку ячэйкі.

Адказныя кіраўнікі займаліся п'янствам, былі зьвязаны з чужым элемэнтам. Пом. нач. пошты Капцюг і начальнік Міхееў у „часы досугу" праяўлялі гэройства—спробы да самагубства, з прычыны неудач у іх інтымных справах. Між іншым іх спробы заўсёды дэманстраваліся перад сваімі падпарадкаванымі асобамі, якія „ратавалі свайго начальніка". На другі дзень усё мяшчанства і чыноўніцтва па ўсе лады сьпявала гэтыя гэройскія ўчынкі сваіх начальнікаў, ячэйка-ж пра гэта ні гуку, бо ў габінэце гэтага „гэроя", куды асобным простым сьмертным забаранялася ўваход, рашаўся лёс усіх і нават ячэйкі. Сэкратар ячэйкі хадзіў на ўзгадненьне пытаньняў к „начу", а той чырвоным алоўкам рабіў карэктывы.

Самакрытыка тут, у ячэйцы, як гэта паказалі праверачныя сходы, беспартыйных не датычылася, г. зн. беспартыйныя ня мелі права крытыкаваць. „Камандныя высоты" мелі ўсе спосабы, каб аградзіць сябе ад гэтай ня вельмі прыемнай рэчы. Факт толькі той, што ў час чысткі беспартыйныя ня выказваліся, а калі хто і выступаў, то толькі мазаў па галоўцы начальства.

Кандыдацкі склад ячэйкі—з вельмі пратэрмінаваным стажам. З імі, як і з беспартыйнымі, ячэйка нічога не праводзіла. Бюро працавала па волі волн, якія ў поглядзе настрояў надыходзілі на яе членаў. Установа, дзе пытаньні рацыяналізацыі, сацыялістычнага спаборніцтва павінны былі займаць значнае месца ў працы, у гэтым напрамку нічога не праводзіла. У рабоце тэлефоннай станцыі было шмат перабояў сярод служачых—склокі і ніхто нічога аб гэтым ня думаў. Адно, што тут рабілася—гэта рамонт будынку, але ад рамонту да рацыяналізацыі работы яшчэ далёка.

Пытаньні барацьбы на ідэалёгічным фронце не займалі у масе ячэйкі свайго адбітку. Члены ня былі знаёмы з галоўнымі задачамі чысткі. Праведзеная чыстка зьявілася сур'ёзнай апэрацыяй у гэтай ячэйцы.

Д.

Праверка і чыстка ячэйкі „Саюзхлеба".

Скончылася праверка і чыстка ячэйкі КП(б)Б „Саюзхлеба". Ячэйка аб'ядноўвае 4 установы: Скурсындыкат, Тэкстыльсындыкат, Саюзхлеб і Стромсындыкат. Праверка выявіла, што ячэйка не вяла рашучай барацьбы з бюракратызмам і цяганінай ва ўстановах. У Скурсындыкаце, Тэкстыльсындыкаце і Саюзхлебе, самакрытыка была ў занядбаньні. Крытыкаваць можна было толькі гледзячы на асобы. Крытыка „адказных" пагражала паўнымі арганізацыйнымі мерамі. У такіх умовах беспартыйныя супрацоўнікі не адважваліся выступіць з крытыкай ненармальнасьцяй і хваравітых зьявішч, якіх было шмат у рабоце апаратаў.

Ячэйка свачасова не рэагавала на выпадкі скажэньня клясавай лініі асобнымі адказнымі працаўнікамі—партыйцамі (Рагацкі, Пэўзнэр, Дрэйзін).

Усяго праверана 21 чалавек, з іх—3 выключаны з партыі і 8 таварышоў атрымалі розныя партспагнаньні.

САМАКРЫТЫКА—БАЛЬШАВІЦКІ МЭТАД РАБОТЫ

Зьвернем увагу на работу дасьледчых устаноў

У апошні час выкрыт шэраг брыдотных зьявішчаў у дасьледчых сельска-гаспадарчых установах Бабруйшчыны. Возьмем Забалацкую балотную гаспадарку. Загадчыкам яе зьяўляўся нехта Шохар А., які ў сваёй рабоце трымаў цесную сувязь з кулаком і прыватнікам. Сельска-гаспадарчыя прадукты, якія атрымоўваліся з вопытнае гаспадаркі, прадаваліся прыватніку. Сотнямі пудоў збывалася капуста і іншыя прадукты спэкулянтам.

Сам Шохар у гор. Рагачэве мае ўласны гарод. Здавалася, што гэты гарод да рабочае сілы вопытнае гаспадаркі ня мае ніякага дачыненьня. Але Шохар інакш разважаў. Для яго не існавала правіл. Рабочых вопытнае гаспадаркі ён скарыстоўваў на сваім уласным гародзе.

Былі выпадкі, калі ён рабочых прымушаў работаць днём і ноччу без перапынку. Аб самакрытыцы тут гаварыць ня прыходзіцца. Таму, хто ўздумаў крытыкаваць суровага начальніка Шохара, даставалася ня мала.

— У мяне свае законы,—так гаварыў ён усім і кожнаму. Пастараўся Шохар звольніць з работы аграномаў Гатальскага і Лейчанку, пабачыўшы, што апошнія пачалі займацца самакрытыкаю і пачалі выступаць супроць непарадкаў, якія тварыў загадчык гэтага вопытнага поля.

У сваёй рабоце ён стараўся акружыць сябе «сваімі людзьмі», каб лягчэй можна было тварыць цёмныя справы.

Не далёка адстаў ад Шохара загадчык Турскае дасьледчае станцыі. Гэтая асоба таксама ня любіла самакрытыкі і ўсялякім чынам старалася прыдушыць яе.

Тут работніцу Белавусаву зьнялі з работы за тое, што яна дазволіла сабе выступаць супроць непарадкаў, якія тварыліся на дасьледчай станцыі пад кіраўніцтвам Драздова. Яе стараліся прымусіць работаць звыш нормы пасьля выступленьня.

Былі выпадкі, калі работнікаў станцыі за тое, што яны пасьмелі крытыкаваць начальства на пасяджэньні савету станцыі, лаялі амаль што апошнімі словамі.

Ды і ня толькі зажымам самакрытыкі славуты загадчык Турскае дасьледчае станцыі. Безгаспадарчасьці тут таксама хапае. Ці можна дапусьціць такое становішча, каб пуні хісталіся ад ветру ў той час, калі вялізарныя сродкі траціліся на развод садкоў і кветак каля дому, дзе жыў сам загадчык? Ці можна гэта дапусьціць такую справу, каб рабочым прыходзілася чакаць пад дажджом загадчыка, пакуль апошні вадумаецца скласьці плян праведзеньня вопыту? Хіба можна дапусьціць такое становішча тут на вопытнай станцыі, каб лубін сеяўся заведама няўсхожым насеньнем?

Чым, як ня самым заядлым шкодніцтвам пахне тут?

Пра адносіны загадчыка Драздова да рабочых нечага гаварыць. Рабочых ён лічыў нечым на манер жывёлы. Жывуць рабочыя ў памяшканьнях горшых за хлявы. Падлогі ў дамох для рабочых няма, хворых пасылаюць у больніцу пешу за некалькі вёрст. Гэта ўсё робіцца ў той час, як кіраўнікі станцый пастараліся сабе адмайстраваць для жыцьця дом як мае быць.

Як першы, так і другі кіраўнікі вопытных гаспадарак ніякае работы не рабілі ў галіне калектывізацыі вёскі. Адрыў ад мас поўны.

Цікавым ува ўсёй гэтай брыдоце зьяўляецца той факт, што ніводная з вышэйшых устаноў, якая наведвала гэтыя дасьледчыя станцыі, не зварачвала да гэтага часу ўвагі на ўсе гэтыя факты. А там-жа бывалі і работнікі Наркамзему і працаўнікі Цэнтральнага Праўленьня саюзу і іншых арганізацый.

Няма сумненьняў, што вінаватыя ў апісаных вышэй справах панясуць належную кару. Загадчык Шохар ужо зьнят з работы. Трэба думаць, што і другога чакае такі самы лёс. Але пасьля гэтых урокаў мы павінны паставіць перад сабою задачу ў далейшым пільна сачыць за работаю нашых дасьледчых устаноў, каб своечасова лячыць хваравітыя зьявішчы ў іх.

А. Дамброўскі.

Ачысьціць лясьніцтвы Старобіншчыны.

(Бабруйская акруга).

На абшарах Старобінскага раёну маецца 3 лясьніцтвы—Старобінскае, Даманавіцкае і Дзякавіцкае, якімі ахопліваецца каля 70 тысяч гэктараў лесу, уключаючы лясы мясцовага значэньня і зямфонды. Апарат л-ваў складае больш 100 чалавек. Работа па лясьніцтвам у параўнаньні з мінулымі гадамі палепшылася. Так Старобінскае л-ва дало даходнасьці ў 28-29 г. каля 250 тысяч руб., тады, як за 27-28 г. толькі 41 тысячу руб.

Ня гледзячы на гэта, работа л-ваў патрабуе палепшаньня, асабліва ў справе падбору апарату, так, перад чысткаю было зволена шмат лясьнікоў. Але сярод тых, што засталіся, ёсьць многа такіх, якія зьвязаны больш са сваёю моцнаю гаспадаркаю, чым з даручанаю справаю па ахове лесу (аб'езчыкі Шарко, Анцыповіч, лясьнік Пятніцкі). Клясавая лінія ня вытрымліваецца ў рабоце л-ваў і асобных працаўнікоў: так Старобінскім л-вам засеян пітомнік у кулакоў на хутарох (дзякуючы чаму апошнія маюць шэраг прывілегій), а лясьнічы Дзямідовіч кажа, што ў інструкцыі не напісана ў каго сеяць—у кулака ці ў бедняка.

Аб'езчык Гужаў п'янствуе з кулакамі, за што ім адбівае лес; а беднаце адмаўляе; кулаком прадае сэквестрыраваны ясень.

Лясьнік Радзюк (Капацэвічы) сэквестрыраваны лес аддае свайму цесьцю, або не зварачвае ўвагі на парубкі, якія робяць яго сваякі. Лясьнік Гешавец з Даманавіцкага л-ва прадаваў лесбелаўскі матар'ял прыватніку. Шэраг наракаваньняў маецца з боку насельніцтва на грубыя адносіны з боку аб'езчыкаў (Гужаў) і лясьнікоў (Пятніцкі).

У Старобінскім лясьніцтве у кіруючай частцы назіраецца склока, падсіжваньне адзін другога, што адбіваецца на рабоце; здаровая самакрытыка адсутнічае. Склочнасьць і падсіжваньне назіраецца і ў Даманавіцкім л-ве, дзе лясьнікі ня ўжываюцца ў адным будынку і падрываюць работу адзін другому. Кулак (былы лясьнік) робіць паклёп на аб'езчыка партыйца абвінавачваючы яго ў п'янстве, хабарніцтве і іншых крымінальных справах, што не сьцьвярджаецца ў сапраўднасьці. Нагляд адміністрацыі за работаю лясьнікоў недастатковы (Староб. л-ва), не абгледжана работа ні воднага вучастку, і толькі выпадкова выяўлена парубка ў лясьніка Кудзелька на 800 руб., які саўмяшчае пасаду лясьніка з пасадаю лістапосца, дзякуючы чаму ня можа ўгледзіць за ўсім.

Сацыялістычнае спаборніцтва паміж лясьніцтвамі, а таксама і паміж працаўнікамі л-ваў не праводзіцца; ні па пытаньням аховы лесу, ні па лепшаму пасеву іх, ні па культывіраваньню. Пытаньне сацыялістычнага спаборніцтва ўзьнімалася ў Старобінскім л-ве, але склочнасьць у кіруючай частцы яго не дала магчымасьці разгарнуцца спаборніцтву. Сувязь з насельніцтвам дрэнная, справаздач ня робіцца, лекцыяў аб лесе ня чытаецца.

На ўсе гэтыя моманты адпаведным органам і саюзу ВЗЛ трэба зьвярнуць увагу, каб палепшыць ахову лесу, разгарнуць сац. спаборніцтва і падабраць належны апарат, які праводзіў-бы клясавую лінію ў л-вах.

І. В.

СКРЫУЛЕНЬНЕ СЕЛЬСАВЕТАМІ КЛЯСАВАЕ ЛІНІІ.

(Быхаўскі раён, Магілеўшчына).

Наша газэта ўжо раней пісала аб Быхаўскім раёне. Гэты артыкул будзе характарызаваць работу нізавога савецкага апарату, галоўным чынам, сельсаветаў, якія вельмі часта скрыўлялі лінію партыі, трымалі шчыльную сувязь з кулаком, папом і г. д., даючы ім усякія палёгкі ў крэдытаваньні, недаабкладаньні падаткамі і г. д.

Калектывізацыя—пабочная справа.

У большасьці сельсаветаў зусім слаба была работа па рэарганізацыі сельскае гаспадаркі, асабліва па калектывізацыі яе. Як вынікі гэтага, па шэрагу сельсаветаў (Грудзінаўскі, Таймацаўскі і інш.) да гэтага часу ня маецца аніводнага калгасу.

Існуючымі калектывамі і прасьцейшым аб'яднаньнямі сельсаветы амаль што ня кіруюць, у выніку чаго маецца шмат выпадкаў, калі разваліваюцца калгасы і прасьцейшыя віды вытворчых аб'яднаньняў.

Пры арганізацыі калгасаў і аб'яднаньняў, сельсаветамі надзвычайна мала зварачвалася ўвагі на сацыяльны падбор калгасьнікаў і членаў прасьцейшых аб'яднаньняў. Маецца шэраг выпадкаў, калі ў калгасы пралезьлі кулакі і заможнікі, якія праводзілі сярод астатніх членаў калгасаў шкодную работу.

У камуну „Пралетарская Рэспубліка", Н. Быхаўскага сельсавету прынят настаўнік Шутаў—кулак, абкладзены індывідуальным падаткам. У Гарадзецкім с-савеце ў камуну «Перамога» прынята два кулакі-індывідуальнікі, з якіх адзін плаціць падатку 258 руб. і другі—181 руб. А Грудзінаўская малочная арцель у большасьці складаецца з заможных. У калгасе Вайштэйна меліся гандляры, пазбаўленыя ў правох і іншыя шкодныя людзі.

Вучот праводзімых мерапрыемстваў у галіне інтэнсыфікацыі сельскае гаспадаркі па ўсіх сельсаветах адсутнічае. Адгэтуль с-саветы ня маюць магчымасьці кіраваць сельскай гаспадаркай у напрамку перабудовы яе на сацыялістычны лад. Асабліва вучот адсутнічае ў пытаньнях праводзеньня агракультурных мерапрыемстваў і вынікаў узьняцьця ўраджайнасьці.

Кулаку—у першую чаргу.

Сельсаветы нават і ня думалі заводзіць вучот крэдытуемых гаспадарак. Крэдыты часта, і вельмі часта, атрымлівалі кулакі, папы і заможная частка.

Грудзінаўскае крэдытнае т-ва выдала кулакам і заможнікам больш 13 проц. крэдыту, беднаце—41 проц. і серадняком—42 проц. Заявы бедняты па крэдытам былі задаволены ўсяго на 69 проц., а кулакоў—на 84 проц. Сярэдні размер пазыкі: для бедняты—70 руб., серадняку—75 руб., а кулакоў—103 р. Крэдытам карыстаўся поп, які на працягу некалькіх гадоў атрымаў крэдыту да 700 руб. На гэты час за заможнікамі лічыцца па крэдыту 478 руб. і за служачымі—450 руб.

Крэдыты не скарыстоўваліся па прызначэньню. У Грудзінаўскім сельсавеце селянін Межунц атрымаў крэдыт 75 руб. на куплю каня і скарыстаў яго на вясельле. Селянін Мяжвед атрымаў 50 руб. і прапіў.

Земляўпарадкаваньне ў загоне.

Земляўпарадкаваньне не цікавіла сельсаветы, яны гэтай работай зусім не займаліся і ўсклалі яе цалкам на земляўпарадкавацеляў і ўпаўнаважаных вёскі, у сувязі з чым хутары насаджваліся без усякай патрэбы. А як вынік гэтага, пры земляўпарадкаваньні вёскі Тошчыца, заможныя, шляхам падзелу сваіх гаспадарак, атрымалі большую плошчу зямлі.

Былі выпадкі продажу зямлі і сенажаці заможнымі і серадняцкімі гаспадаркамі для аплаты за земляўпарадкаваньне. Запазычанасьць за заможнай часткай па земляўпарадкаваньні па некаторых сельсаветах цягнецца яшчэ з 1927 году.

Рэгуляваньне зямельных канфліктаў праходзіць з валакітай і часта вырашаецца ў карысьць заможнікаў (Н-Быхаўскі с-с).

Справы ад беднякоў-сялян ляжаць у сельсаветах па месяцох не разгледжанымі.

У некаторых с-с індывідуальнае абкладаньне не праведзена поўнасьцю. Маецца шмат неабкладзеных кулакоў. У Грудзінаўскім с-с у в. Рышкаўцы, кулак Зэлікаў, які мае 10 дзесяцін пахаты, 5 сенажаці, 4 каровы, 3 кані, малатарку, веялку і іншы інвентар—індывідуальна не абкладзен.

У Н-Быхаўскім ня быў абкладзен кулак-вастаўнік—**Шутаў** і яго нават прыкрываў член Райвыканкому—**Рудкоўскі**. Па шмат якім с-с і да сёньняшняга дню ёсьць недавучот аб'ектаў абкладаньня.

Каапэрацыя засьмечана.

Спажывецкая гаспадарча-крэдытная каапэрацыя мае шмат хваробных зьявішчаў. У спажывецкай каапэрацыі маецца вялікая засьмечанасьць папамі, кулакамі і інш. асобамі, а таксама растраты і сувязь з чужым элемэнтам. У складзе ўпаўнаважаных каапэрацыі маецца шмат серадняком, заможнікаў і нават кулакоў. У адным з таварыстваў бухгальтэрам працуе сын папа, які камісіяй па чыстцы савецкага апарату вычышчан, але і да гэтага часу працягвае працаваць.

Перавыбары спажывецкае каапэрацыі прайшлі нездавальняюча. Кулацкая групіроўка ня дала магчымасьці склікаць сходаў бедняты, нават былі выпадкі, калі кулакі імкнуліся разагнаць гэтыя сходы бедняты. У адным таварыстве поп разьмяркоўваў тавары сярод пайшчыкаў. Дэфіцытныя тавары часта разьмяркоўваліся сярод заможнікаў і кулакоў (Н-Быхаўскае і Грудзінаўскае таварыствы).

Што нам сын бедняка, лепш сыну дзяка і заможніка.

У большасьці школ рамонт зроблен своечасова, але маюцца і такія с-с, якія гэтым пытаньнем не займаліся. Заняткі ў некаторых школах пачаліся са значным спазьненьнем. Ёсьць школы, дзе і зараз няма настаўнікаў. Сталы нагляд за палітасьветнымі ўстановамі з боку с-с адсутнічае, у выніку чаго мела месца, калі настаўнікі да вучняў прымалі меры „фізычнага выхаваньня" (Голубаў і Шутаў—Н-Быхаўская школа, Кротаў—Лазовіцкая).

Сродкі на дапамогу дзецям бедняцы вельмі часта траплялі дзецям заможнікаў, кулакоў, дзякоў і г. д. У Рышкаўскай школе дапамогу атрымалі Бука М.—дачка крамніка, Лаўроў—сын дзяка, Сіўцова—бацька мае 2 кані і 2 каровы і інш. Гэта ўсё рабілася самімі настаўнікамі, якія трымалі шчыльную сувязь з кулакамі і заможнікамі, а с-с і сельКСУ не цікавіліся гэтай справай.

Папярэдзім урокі Быхаўшчыны.

Паданыя прыклады сьведчаць, што сельсаветы ў сваёй рабоце не трымаліся акрэсьленага клясавага прынцыпу і гэтым самым досыць часта дапамагалі клясаваму ворагу.

Урокі Быхаўшчыны трэба ўлічыць і папярэдзіць такія абураючыя факты ў іншых мясцох.

Ал. Сянкевіч.

Зьнішчым пратэрміноўку па сельска-гаспадарчага крэдыту.

У сучасны момант па Аршанскай акрузе налічваецца значная запазычанасьць (пратэрміноўкі па пазыках) насельніцтва па сыстэме сельска-гаспадарчага крэдыту. Усяго гэта запазычанасьць дасягае 194.200 р., з якіх за сялянствам, аслабаненым ад сельгаспадатку, лічыцца 108.700 р. альбо 55,8 проц., за гаспадаркімі з падаткам да 10 р.—21,1 проц., за гаспадаркамі звыш 10 р. без надбаўкі—11 проц., за гаспадаркімі звыш 10 р. з процантнай надбаўкай—0,3 проц., за індывідуальнікамі—0,1 проц., за каапэрацыйнымі арганізацыямі—8,8 проц. і за рознымі асобамі, якія маюць сувязі з сельскай гаспадаркай—2,3 проц.

Работа па спагнаньню запазычанасьці і мабілізацыі сродкаў па сыстэме сельска-гаспадарчага крэдыту праходзіць нездавальняюча.

На 30 крэдытных таварыствах за квартал сабрана 180 тыс. р. па ўсім відам узысканьняў, што складае усяго 17 проц. выкананьня квартальнага пляну. Сума пратэрміновак па пазыках наогул крыху зьнізілася па некаторых раёнах, як напрыклад, па Аршанскаму, Багушэўскаму, Дрыбінскаму, Копыскаму, Расьнянскаму і Крупскаму—дала падвышэньне. Асабліва пагражаючымі раёнамі ў справе пратэрміновак зьяўляюцца раёны: Чарэйскі, Дубровенскі, Ляднянскі, Аршанскі, Крупскі, Горацкі і Расьнянскі. Там пратэрміноўкі займаюць значнае месца.

Такім чынам бачна, што работа па мабілізацыі сродкаў па сыстэме сельска-гаспадарчага крэдыту да гэтага часу яшчэ не прыняла належнага тэмпу. Нават наглядаецца паслабленьне ў справе датэрміновага спагнаньня запазычанасьці з кулакоў, служачых, пазбаўленцаў і асоб, якія няправільна скарысталі атрыманую пазыку.

У сучасны момант дадзена заданьне ўсім райвыканкомам, акрсельбанку і акрсельсаюзу ў двухтыднёвы тэрмін правесьці ўзысканьне пазык і недаімкі мінулых гадоў, пратэрмінованых пазык, якія выдадзены арганізацыям і сялянам па кантрактацыі, а таксама і неправільна выдадзены—кулакам, пазбаўленцам, служачым і неправільна скарыстаны, забясьпечыўшы недапушчэньне новых пратэрміновак. На працягу бліжэйшага часу патрэбна дабіцца ўцягненьня ў барацьбу з пратэрміноўкамі ўсяго насельніцтва, усяго савецкага актыву і шырокіх колаў працоўнага сялянства. Злосныя неплацельшчыкі будуць прыцягвацца да крымінальнай адказнасьці, праз арганізацыю над імі паказальных працэсаў.

У сучасны момант ставіцца пытаньне аб тым, каб паставіць работу так, каб калгасы і іншыя каапэрацыйныя арганізацыі былі прыкладнымі ў справе своечасовай здачы закантрактаванага і пазык.

Гэтыя меры павінны будуць значным парадкам пасунуць уперад справу ліквідацыі запазычанасьці насельніцтва па сыстэме сельска-гаспадарчай крэдытнай каапэрацыі і мабілізацыі сродкаў, тым больш, што ў сучасны момант **старшыням праўленьняў Расьнянскага, Багушэўскага, Талачынскага, Горацкага, Ляднянскага і ўсяму складу Дрыбінскага крэдытнага сельска-гаспадарчага таварыства абвешчаны вымовы, а старшыні Горацкага, Межаўскага і Бобрскага зьняты з работы і аддаюцца пад суд.**

А. Мілашэўскі.

ЗАКОНЫ І ПАСТАНОВЫ ЎРАДУ БССР

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

ПРА ДАПАЎНЕНЬНЕ П. „Л[1]“ АРТ. 3 „ПАЛАЖЭНЬНЯ ПРА НАРОДНЫ КАМІСАРЫЯТ ГАНДЛЮ БССР“.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляюць** дадаць да арт. 3 „Палажэньня пра Народны Камісарыят Гандлю БССР“ (З. З. БССР 1929 г., № 34, арт. 319) п. „Л[1]“ наступнага зьместу:

„Л[1]“) рэгуляваньне рыбнай гаспадаркі і кіраўніцтва рыбапрамысловымі прадпрыемствамі рэспубліканскага і мясцовага значэньня“.

СТАРШЫНЯ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БССР А. ЧАРВЯКОЎ
НАМ. СТАРШЫНІ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР М. КАРКЛІН
САКРАТАР ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БССР А. ХАЦКЕВІЧ

17 лістапада 1929 г.
г. Менск.

Постановление

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

О ДОПОЛНЕНИИ П. „Л[1]“ СТ. 3 „ПОЛОЖЕНИЯ О НАРОДНОМ КОМИССАРИАТЕ ТОРГОВЛИ БССР“

Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР **постановляют** дополнить ст. 3 „Положения о Народном Комиссариате Торговли БССР“ (С. З. БССР 1929 г., № 34, ст. 319) п. „Л[1]“ следующего содержания:

„Л[1]“) регулирование рыбной промышленности и управление государственными рыбопромышленными предприятиями республиканского и местного значения“.

ПРЕДСЕДАТЕЛЬ ЦЕНТРАЛЬНОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА БССР А. ЧЕРВЯКОВ
ЗАМ. ПРЕДСЕДАТЕЛЯ СОВЕТА НАРОДНЫХ КОМИССАРОВ БССР М. КАРКЛИН
СЕКРЕТАРЬ ЦЕНТРАЛЬНОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА БССР А. ХАЦКЕВИЧ

17 ноября 1929 г. гор. Менск

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

ПРА ЗЬМЕНУ ПАСТАНОВЫ ЦВК І СНК БССР „АБ КІРАЎНІЦТВЕ РЫБНАЮ ГАСПАДАРКАЙ“.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляюць** у артыкулах 2, 3, 4 і 8 сваёй пастановы за 21 лістапада 1924 году „Аб кіраўніцтве рыбнай гаспадаркай“ (З. З. БССР 1925 г. № 4—5, ст. 14) словы: „Народны Камісарыят Земляробства“ замяніць словамі: „Народны Камісарыят Гандлю“.

СТАРШЫНЯ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БССР А. ЧАРВЯКОЎ.
НАМ. СТАРШЫНІ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР М. КАРКЛІН.
САКРАТАР ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

17 лістапада 1929 г. гор. Менск.

Постановление

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

ОБ ИЗМЕНЕНИИ ПОСТАНОВЛЕНИЯ ЦИК И СНК БССР „ОБ УПРАВЛЕНИИ РЫБНЫМ ХОЗЯЙСТВОМ“.

Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют в статьях 2, 3, 4 и 8 своего постановления от 21-го ноября 1924 года „Об управлении рыбным хозяйством“ (С. З. БССР 1925 года, № 4—5, ст. 14) слова: „Народный Комиссариат Земледелия“ заменить словами: „Народный Комиссариат Торговли“.

ПРЕДСЕДАТЕЛЬ ЦЕНТРАЛЬНОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА БССР А. ЧЕРВЯКОВ.
ЗАМ. ПРЕДСЕДАТЕЛЯ СОВЕТА НАРОДНЫХ КОМИССАРОВ БССР М. КАРКЛИН.
СЕКРЕТАРЬ ЦЕНТРАЛЬНОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА БССР А. ХАЦКЕВИЧ.

17 ноября 1929 г. гор. Минск.

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

ПРА НАДАНЬНЕ СТАРШЫНІ БЕЛСЕЛЬГАСЗАБУ ПРАВА ПАДПІСВАЦЬ АД ІМЯ БЕЛСЕЛЬГАСЗАБУ ЎСЕ ВЭКСАЛІ І ІНШЫЯ ДАКУМЭНТЫ ГРАШОВАГА ХАРАКТАРУ, ЯКІЯ ВЫНІКАЮЦЬ З АПЭРАЦЫЙ БЕЛСЕЛЬГАСЗАБУ.

Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

Даць Старшыні Белсельгасзабу права падпісваць ад імя Белсельгасзабу ўсе вэксалі і іншыя дакумэнты грашовага характару, якія вынікаюць з апэрацый Белсельгасзабу.

СТАРШЫНЯ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР М. ГАЛАДЗЕД.
КІРАЎНІК СПРАЎ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ І ЭКАНАМІЧНАЙ НАРАДЫ БССР М. КАЛЕВІЧ.

23-га лістапада 1929 г.
г. МЕНСК.

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

ПРА ГРАНІЧНЫ РАЗЬМЕР СТАВАК МЯСЦОВАГА ПАДАТКУ З БУДЫНКАЎ НА 1929-30 БЮДЖЭТНЫ ГОД.

Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

Устаноўлены пастановаю СНК БССР за 24 сьнежня 1928 г. „Пра гранічны разьмер мясцовага падатку з будынкаў на 1928-29 год“ (З. З. БССР 1928 г. № 37, арт. 358) гранічны разьмер мясцовага падатку з будынкаў ужываць і ў 1929-30 бюджэтным годзе.

СТАРШЫНЯ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР М. ГАЛАДЗЕД
КІРАЎНІК СПРАЎ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ І ЭКАНАМІЧНАЙ НАРАДЫ БССР М. КАЛЕВІЧ.

23-га лістапада 1929 г.
г. МЕНСК.

КААПЭРАЦЫЮ—ПАД КАНТРОЛЬ МАС

Абсьледваньне працы па зьніжэньню розьнічных цэн у ЦРК.

Па пяцігадоваму пляну разьвіцьця народнае гаспадаркі прадугледжваецца значнае палепшаньне дабрабыту рабочае клясы шляхам рэальнага павялічэньня заработнай платы. Адной з неабходных умоў рэальнага (фактычнага) павялічэньня зарплаты зьяўляецца пытаньне кошту пражыцьця рабочага, што дасягаецца агульным патаненьнем тавараў першай неабходнасьці, якія штодзённа спажывае работы. У зьвязку з гэтым з боку Белкаапсаюзу было праведзена шэраг практычных мерапрыемстваў, якія выявіліся ў пашырэньні каапэрацыйнага рынку, шляхам сканцэнтраваньня асобных галін спажываньня рабочага вакол каапэрацыі (аб'яднаньне ў каапэрацыі мяса і гародніны) а галоўнае—гэта зьніжэньне розьнічных цэн у нашых каапэрацыйных крамах на тавары штодзённага спажываньня.

Для ажыцьцяўленьня гэтага мерапрыемства з боку Белкаапсаюзу ў канцы мінулага гаспадарчага году было праведзена абсьледваньне працы па зьніжэньню розьнічных цэн на тавары першай неабходнасьці па ўсіх ЦРК Беларусі. Абсьледваньне выявіла цэлы шэраг недахопаў і скрыўленьняў палітыкі цэн па паасобным ЦРК і дала практычныя зазначэньні па выпраўленьні знойдзеных недахопаў, а таксама намецiла асноўныя вехі працы па зьніжэньню цэн на далейшае. У бягучым гаспадарчым годзе Белкапсаюзам маркуецца правядзеньне яшчэ аднаго абсьледваньня працы паасобных ЦРК.

Гэтым абсьледваньнем маркуецца дасканала праверыць працу гэтых ЦРК па ўсіх галінах. Галоўная ўвага пры абсьледваньні ЦРК будзе зьвернута ў першую чаргу на тое, як рабочыя апаратывы падыйшлі да лепшага абслугоўваньня пайшчыкаў, як праводзіцца зьніжэньня цэн, ці адпавядае асартымэнт тавараў патрабаваньням рабочага спажыўца. Поруч з гэтым абсьледваньнем маркуецца выявіць, як ідзе праца па сацыялістычнаму спаборніцтву, як разгорнута самакрытыка, агульна-масавая праца, культпраца і г. д. Пытаньні арганізацыйнага характару, пляцаваньня працы, арганізацыя лавачнай грашовай гаспадаркі, рацмінімум таксама займуць адно з галоўных месц пры абсьледваньні. Апрача гэтага камісія па агляду працы ЦРК павінна вырашыць досыць хваравітае пытаньне, гэта пытаньне грамадзкага харчаваньня, агляд становішча сталовак, а таксама пытаньне хлабапячэньня і забесьпячэньне хлебам пайшчыкаў. Разам з аглядам працы ЦРК, камісія разгледзіць усе скаргі і незадаволеньні пайшчыкаў.

У зьвязку з важнасьцю гэтага мерапрыемства, на абсьледваньні працы нізавых цэрабкопаў павінна быць завострана ўвага ўсёй нашай грамадзкасьці.

Рабсэкцыя Белкаапсаюзу мяркуе пачаць абсьледваньне працы паасобных ЦРК у сьнежні месяцы бягучага году.

У першую чаргу мяркуецца абсьледваць Мазырскі, Полацкі і Рэчыцкі ЦРК.

М. П.

Трэба спыніць „дзеляцтва“.

(Чырвона-Слабодзкі раён, Бабруйшчына).

У красавіку м-цы г. г. на пасаду Старшыні Чырвона-Слабодзкага Спаж. т-ва быў вылучан т. Кустановіч, які да гэтага часу працаваў у Цэрабкопе ў Бабруйску. Працуючы ў Цэрабкопе, ён меў вымаву за дрэнную пастаноўку культпрацы, там-жа ён растраціў каля дзевяцісот рублёў, за якую будзе прыцягнут да адказнасьці. Па прызначэньню ў Чырвона-Слабодзкае Спаж. т-ва Кустановіч пачынае тварыць свае цёмныя справы. Ён атрымлівае па свайму ўласнаму загаду 214 рублёў пад'ёмных бяз згоды на гэта ўпаўнаважаных і Праўленьня т-ва. Кустановіч сам не зьяўляецца нават пайнікам т-ва, а атрымлівае заўсёды самыя лепшыя адрэзы сукна і іншыя тавары пры кожнай прывозцы. Не забывае Кустановіч сваіх садружаньнікаў, якіх ён за кароткі час сумеў нажыць у Чырв. Слабадзе. Кустановіч забясьпечваў іх сукном і іншымі дэфіцытнымі таварамі, якія атрымацелі ўмудраліся перапрадаваць на прыватным рынку.

За час працы Кустановіча ў т-ве ня было ніводнага сходу ўпаўнаважаных, ня зроблена ніводнай справаздачы перад пайнікамі. Пасяджэньні Праўленьня бываюць нерэгулярна. Культурнай працы сярод пайнікаў ніякай не вялося. Самакрытыка была ў загоне. У часы хлебазагатовак Кустановіч дэзарганізоўваў рынак-вёў з мясцовым Крэдытным т-вам канкурэнцыю.

Прамтаварамі т-ва забясьпечвалася нярэгулярна. Пайнікаў-служачых забясьпечвалі сырым хлебам, які пяклі яго садружаньнікі.

Загатаўцамі спаж. т-ва зьяўляюцца лішэнцы, б. гандляры, якія дыскрэдытуюць каапэрацыю перад працоўнымі масамі, але на гэта Кустановіч не рэагіруе, а наадварот садзейнічае.

Ваколічнае насельніцтва і пайнікі патрабуюць утварыць над Кустановічам зараз-жа паказальны суд.

І. П.

З лістоў каапкораў.

Фонд, асыгнаваны для каапэраваньня беднаты капыльскай спажывецкай каапэрацыі, скарыстоўваецца на каапэраваньне серадняцтва, у той час, калі бедната гэтым фондам не ахоплена.

А. Вядомы.

* * *

Тураўскае спажывецкае таварыства няправільна разьмяркоўвае растэрмінаваньні для ўнясеньня паю напова ўступаючым пайшчыкам. Гр. Дарошка З., бацька якой серадняк—далі растэрмінаваньне ўнясеньне паю, гр. Блоцкаму Рыгору, які плаціць 6 руб. падатку—прапанавалі поўнасьцю ўнесьці 15-рублёвы пай.

Старшыня Верасьніцкага КСУ выдаў справку гр. Мажака Васілю аб тым, што ад падатку вызвалены і ня можа ўнесьці 15-рублёвы пай, у той час калі Мажака плоціць падатак.

Праўдзін.

* * *

Сталоўка Полацк. ЦРК ў дзень 12-й гадавіны Кастрычніка была зачынена, ня гледзячы на пастанову Гарсавету аб тым, каб сталоўка ў гэты дзень абслугоўвала пайшчыкаў. Праўленьне ЦРК сьвяткавала ў сталоўцы 12-ю гадавіну, а пайшчыкі хадзілі галодныя.

В.

* * *

У дамачавіцкім спажывецкім таварыстве ў якасьці агента па загатоўках сыравіны працуе нэпман Я. Кантар. Кантар 15 год меў сваю краму, зараз пазбаўлены выбарчых правоў. Сыноў Кантара выключылі са школы сялянскай моладзі, як сыноў нэпмана. Усё гэта робіцца на вачох ячэйкі КПБ і сельсавету.

Пайшчык.

* * *

У спажывецкай краме м. Бялынкавічы Магілеўскай акр., заг. крамы Яўзовіч і яго памочнік Кобзыраў падзяляюць пайшчыкаў на „сваіх і чужых“. Для першых ёсьць і тавар і крэдыт, для апошніх—ні таго, ні другога. Рэвізіяй устаноўлена, што Яўзовіч бяз ведама праўленьня раздаў крэдыт на 600 руб. Адносіны да пайшчыкаў з боку «каапэратараў» грубыя. Скрынкі для скаргаў у краме няма. Пайшчыкі такімі «каапэратарамі» незадаволены.

Вока.

* * *

Праўленьне горацкага спажывецкага таварыства ўзяло вучнем у краму гр. Скарабагатаву, бацька якой зараз знаходзіцца пад сьледзтвам за нерадачу картачак па вучоту коняй канакрадам.

Камсамолак Гурэвіч і Райхін, якія маюцца ў броні, праўленьне на працу чамусьці не прыняло. Дагавор па сацыялістычнаму спаборніцтву праўленьнем яшчэ не заключаны.

Даркевіч.

* * *

У сталоўцы Мазырскага ЦРК афіцыянты хутка падаюць гарбату толькі тым „важным дзядзям“, якія добра апрануты, а калі хто прыдзе ў сталоўку ў дрэнным паліто—дык досыць пачакаецца. Рэвізійнай камісіі трэба зьвярнуць на гэта ўвагу.

Трубка.

* * *

У г. Дуброўна, Аршанскай акр. кіраўнікі аптэкай пры продажы простага мыла, што зьяўляецца таварам дэфіцытным, дадаюць яшчэ ў абавязковым парадку пляшачку парфумы. Насельніцтва незадаволена гэтым. Трэба зьнішчыць такое зьявішча.

В.

* * *

Каапэрацыйная крама ў м. Леніна, Слуцкай акр. часта адчыняецца ў 10-11 гадзін раніцы, у той час калі зачыняецца роўна а 9-й гадзіне. З боку прадаўцоў заўважаюцца грубыя адносіны да пакупнікоў. «Сваім» тавары даюцца без чаргі. Дзякуючы нядбайнасьці каапэратараў бываюць частыя перабоі ў забесьпячэньні крамы неабходнымі таварамі.

Я.

* * *

Дуброўскае спажывецкае таварыства Гарадоцкага раёну Віцебскай акр. не клапаціцца аб сваіх пайшчыках і не забясьпечвае іх патрэбнымі прадуктамі, напрыклад, мукою. Асабліва гэта цяжка адбіваецца на настаўніках і служачых, якія ня маюць сваёй гаспадаркі.

М.

* * *

У Сеньніцкай каапэрацыі Віцебскай акругі дэфіцытныя тавары адпушчаюцца толькі тым пайшчыкам, якія здаюць сыравіну, ды беднякам, якія маюць 10-ці рублёвы пай. Настаўніцтва, дзякуючы таму, што ня мае сыравіны і збожжа для здачы, а таксама не падыходзіць да катэгорыі беднякоў, засталося неабслужаным каапэрацыяй. Працаўнікам Сеньніцкага спажывецкага таварыства трэба гэта пытаньне ўрэгуляваць

К. Дзямешкін.

* * *

Капаткевіцкае спажывецкае таварыства Мазырскай акругі замест сталоўкі, у якой адчуваецца вялікая патрэба з боку пайшчыкаў і служачых—адчыніла гарбатню. У гарбатні апроч гарбаты ды піва нічога няма. Пайшчыкі гэтым вельмі незадаволены.

Бяздольны.

Вынікі першага спатканьня.

1 сьнежня 1929 г. у Доме Пісьменьніка адбылося спатканьне пісьменьнікаў з мастакамі. Гэта было, як сказаў у сваёй прамове тав. Пекрашэвіч, першая за 12 гадоў рэвалюцыі вылазка ў сьвет мастакоў.

Мастацкая нарада зрабіла гэта спатканьне з мэтай накіраваць наша выяўленьне мастацтва на шляху сацыялістычнага будаўніцтва.

У сваёй прамове прадстаўнік РОМБ (Рэвалюцыйная Організацыя Мастакоў Беларусі) вызначыў шляхі разьвіцьця беларускага мастацтва. Ён узяў характэрны прыклад з мастаком Філіповічам, які ад пераймання твораў сусьветных мастакоў ішоў да шуканьня свайго беларускага нацыянальнага стылю. За гэтае шуканьне яго асудзілі.

Пісьменьнікі заўважылі мастакам аб іхнім адрыве ад жыцьця, што зразумела і выклікае блытаніну ў напрамку стылю, зьместу і г. д. Выклікае такія мяшчанска-абывацельскія, рэакцыйна-контр-рэвалюцыйныя прамовы, як прамова мастака Гутмана, які сказаў, што рабочы не разумее мастацтва і захапляецца толькі „сабачкай з бантікам“, сухараўскай творчасьцю.

Такі пагляд на рабочага зьяўляецца рэакцыйным, шкодным, бо супярэчыць нашым поглядам на рабочага і на тое мастацтва, якое павінна служыць рабочай клясе.

Цэлым шэрагам таварышоў заўважвалася, што ромбаўцы адначасова малюючы вокладкі на кніжкі, лічаць гэта немастацтвам, у той час, калі даюцца вокладкі дрэнныя. Што яны імкнуцца тварыць мастацтва для мастацтва. Што няма ў іх творах ні новай формы, ні новага зьместу. Адсюль і зразумела, чаму ў той час, калі ў нашых пісьменьнікаў ёсьць ужо няўміраючыя творы, ёсьць імкненьні адбіць сучаснасьць, мастакі амаль што зусім ня цікавяцца гэтым, хоць і называюць сябе рэвалюцыйнай арганізацыяй.

Таксама шэрагам таварышоў заўважалася на незразумеласьць твораў нашых мастакоў, на адсутнічаньне ідэалёгіі і г. д. У спрэчках выступалі т.т. Некрашэвіч, Волкаў, Гутман, Андрэй Александровіч, Гародня, Міхась Чарот, Бабарэка, Язэп Пушча.

К.

Выпіс з пастановы Прэзыдыуму ВСНГ БССР

па дакладу групы эканомікі працы аб выкананьні прадпрыемствамі дагавароў па ахове працы за 28-29 г.

1. Канстатуючы невыкананьне трэстамі і прадпрыемствамі дагавароў з органамі НК Працы на мерапрыемствы па ахове працы за 28-29 г. (з агульнай сумы 690 т. р., няскончаны работы па мерапрыемствам аховы працы на 1-Х—29 г. на суму 418 т. р., альбо на 58 проц., а невыдаткавана на ахову працы па дагаворам 305 т. р., альбо 40 проц.), Прэзыдыум ВСНГ БССР адзначае, што паказанае становішча ўтварылася галоўным чынам, дзякуючы няўважлівым і нядбайным адносінам і незацікаўленасьці з боку трэстаў і прадпрыемстваў да гэтай справы, у прыватнасьці:

а) ня было належнай папярэдняй падрыхтоўкі і сур'ёзных адносін пры заключэньні паказаных дагавароў (ня ўлічвалася наяўная немагчымасьць выкананьня шэрагу мерапрыемстваў у вызначаныя ў дагаворах тэрміны, таксама і розныя аб'ектыўныя абставіны і перашкоды);

б) адсутнічаў нагляд і кантроль з боку трэстаў за сваечасовым выкананьнем прадпрыемствамі дагавароў па ахове працы;

в) непадрыхтаванасьць і спазьненьне ў выкананьні мерапрыемстваў на прадпрыемствах;

г) недастаткова рашучае рэагаваньне на марудНасьць выкананьня работ па ахове працы з боку акцыйнага Т-ва „Тепло и Сила“ (Тэкстыльтрэст, Папертрэст і Мэталятрэст);

д) наяўнасьць самастойных зьмен мерапрыемстваў, агавораных у дагаворах з боку мясцовых органаў НКПрацы і прадпрыемстваў пры частым садзейнічаньні заводзкіх прафсаюзных ворганаў (Мазырск. зав. Лесбелу, зав. імя Томскага у Рэчыцы, броварн. зав. „Пралетары“ і інш.).

2. Лічучы такія адносіны да пытаньня ў ахове працы абсалютна недапушчальнымі і адзначаючы няўважлівасьць трэстаў і прадпрыемстваў да выкананьня катэгарычных дырэктыў з боку ВСНГ БССР аб неабходнасьці сваечасовага выкананьня дагавароў па ахове працы, Прэзыдыум ВСНГ БССР пастанаўляе:

Кіраўніку Лесбела (па лесадрэваапрацовачн. і запалкавай вытворчасьці) т. Дварэцкаму і намесьніку кіраўніка Мэталятрэсту абвясьціць вымову за недастатковы кантроль і за няпрынятыя мер да сваечасовага выкананьня дагавароў і за несваечасовае выкананьне дырэктывы ВСНГ БССР аб прадстаўленьні справаздач па гэтаму пытаньню.

3. Прапанаваць трэстам зараз-жа прыступіць да дэталёвай праверкі выкананьня прадпрыемствамі дагавароў па ахове працы і ў адносіне вінаватых у нядбайных адносінах да гэтай справы, як па трэстам, так і па прадпрыемствам прыняць меры спагнаньня.

4. Пад асабістую адказнасьць кіраўнікоў трэстаў і дырэктароў прадпрыемстваў прыняць усе захады да хутчэйшага сканчэньня ўсіх работ па ахове працы, прадугледжаных дагаворамі. Астатні тэрмін выкананьня гэтага вызначыць 1 студзеня 30 г. Пасьля сканчэньня гэтага тэрміну прадставіць не пазьней 10-га студзеня 30 г. у ВСНГ БССР (групы эканомікі працы) належныя зьвесткі.

Групе эканомікі працы аб выніках выкананьня гэтай пастановы паставіць даклад на пасяджэньне Прэзыдыуму.

Выдаткі на сканчэньне работ па ахове працы утварыць за кошт не выдаткаваных асыгнаваньняў 28-29 г., згодна загаду ВСНГ.

5. Прымаючы пад увагу, што ў мінулым гасп. годзе большасьць асыгнаваньняў па ахове працы не дае дастатковай эфэктыўнасьці і мала было ададзена ўвагі на тэхніку забясьпекі, даручыць трэстам і групе эканомікі працы пры канчатковым удакладненьні мерапрыемстваў на ахове працы ў прамфінплянах 29-30 г., накіраваць сродкі на больш эфэктыўныя мерапрыемствы і зьвярнуць максымальную ўвагу на тэхніку забясьпекі.

6. Даручыць зацікаўленым трэстам прыцягнуць да адказнасьці акц. т-ва „Тепло и Сила“ за невыкананьне дагавароў па работам аховы працы.

7. Гэтую пастанову апублікаваць у друку.

Старшыня ВСНГ БССР **Грысевіч.**

За Сакратара ВСНГ **Змачынскі.**

17-ХІ—29 г.

Апавяшчэньні.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— Сёньня 3-ХІІ г. г. а 7-й гадз. увечары адбудзецца працягненьне сходу працаўнікоў з удзелам асьветнікаў г. Менску па пытаньню аб падручніках для масавых школ—дакл. т. Мазур.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ

ДОМ ПІСЬМЕНЬНІКА

У Сераду 4 сьнежня — У Сераду 4 сьнежня

вечар-альманах

УЗВЫШЭНСКАЙ ТВОРЧАСЬЦІ

Чытаюць:
Кузьма Чорны — — Апошняя новэля
Максім Лужанін — — Салімонка — (поэма)
А. Мрый — — — Апавяданьне Самсона Самасуя

Пасьля чыткі шырокае абгаварэньне. Запрашаюцца ўсе жадаючыя.

Пачатак а 7-й гадзіне.

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА“.	З панядзелка 2 сьнежня **„РЭЙКІ ГУДУЦЬ“** і кіно-хроніка БЕЛДЗЯРЖКІНО.
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».	Нямецкі фільм **„ЗЯЛЁНЫ ЗАВУЛАК“** драма ў 6 частках. звыш праграмы: Хроніка савкіно № 65.
1-Ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР“	З панядзелка 2 сьнежня Новы фільм савецкай вытворчасьці **„МАНІФЭСТ“** у 5 частках звыш праграмы: Цёмны канёк камэдыя ў двух частках.
КІНО „ПРАЛЕТАРЫ“	З панядзелка 2 сьнежня новы бытавы фільм **„НА ЗАВАРОЦЕ“** драма ў 6 частках. звыш праграмы: „Яна гэта ён“ у 2 част. Пачатак а 7 гадзіне. Чарговая пастаноўка „СЫН ЗОРРО“.

ГОСИЗДАТ РСФСР КНИГА-ПОЧТОЙ, МИНСК

КНИГА-ПОЧТОЙ высылает все книги на русском языке, имеющиеся на книжном рынке, немедленно по получении заказа;

КНИГА-ПОЧТОЙ извещает свою постоянную клиентуру о выходящих новинках по интересующим ее вопросам;

КНИГА-ПОЧТОЙ высылает книги почтовыми посылками или бандеролью наложенным платежом; При высылке всей стоимости вперед—Пересылка бесплатно.

Заказы посылайте по адресу:

ГОСИЗДАТ РСФСР КНИГА-ПОЧТОЙ, МИНСК

Абавязковая пастанова № 41

Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў.

Гор. Менск, 2 сьнежня 1929 г.

Аб парадку складаньня домакіраўніцтвамі сьпісаў асоб, якія займаюцца дробнай (няцэнзавай) прамысловасьцю.

На падставе пастановы ЦВК і СНК БССР ад 17-ХІ-29 г. (апублікавана ў газэце «Савецкая Беларусь» за № 267 ад 24-ХІ-г. г.), Менскі Гарадзкі Савет Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў **пастанаўляе:**

1) Абавязаць домакіраўніцтвы і дамаўласьнікаў да 5 сьнежня 1929 г. скласьці сьпісы ўсіх няцэнзавых прамысловых прадпрыемстваў, належачых дзяржаўным, каапэрацыйным і грамадзкія установам і прыватным асобам, якія абслугоўваюць насельніцтва і выпускаюць сваю прадукцыю на рынак.

Увага 1: Рэгістрацыі падлягаюць: кузьні, млыны, апрацоўка мінэралаў (цэглы, глінянай пасуды, кафлі, ванны і г. д.), апрацоўка ўсіх відаў драўніны (лесапілкі, сталярні, ізгатаўленьне кошыкаў, ложак, рагож, цацак, калёс, абодзьдзяў, дуг, саней, бандарная вытворчасьць і г. д.), выраб скур, аўчын, валёнак, ваўначоскі, сыраварні, маслабойні, каўбасныя, капцільныя, хлебапякарні, булачныя, баранчныя, краўцы, шаўцы шорнікі, такарна-сьлясарная вытворчасьць, выраб с.-г. машын і арудзій, выраб войлаку, апрацоўка волосу, шчаціны і г. д.

Увага 2: Не падлягае перапісу: будаўнічая прамысловасьць, транспарт усіх родаў, гандлёвыя прадпрыемствы (растараны, харчэўні, сталоўкі, лазьні), цырульні, прачкі, чысьцільшчыкі абутку, фатографы.

2) Складзеныя сьпісы павінны захоўвацца ў домакіраўніцтве і падаюцца рэгістратарам Акрстатбюро па правядзеньні перапісу ў час людкі іх у дамаўладаньне за сьпісам, пры чым, у выпадку адсутнасьці ў домаўладаньні прадпрыемства, альбо асоб, што займаюцца промыслам домаўладаньні павінны даць аб гэтым рэгістратару пісьмовую даведку.

3) Усе кіраўнікі і ўласьнікі прадпрыемстваў дробнай (няцэнзавай) прамысловасьці абавязаны даваць рэгістратарам патрэбныя зьвесткі па ўсім пытаньням перапісу.

4) Асобы вінаватыя ў парушэньні гэтае абавязковае пастановы падлягаюць адміністрацыйнай адказнасьці: штрафу да 100 руб., альбо прымусовым працам да 1-го месяцу.

5) Гэтая абавязковая пастанова ўваходзіць у сілу з дню яе апублікаваньня

Намесьнік Старшыні Менскага Гарадзкога Савету КРУЗМАТ.
Сакратар Менскага Гарадзкога Савету ПАСЫНКОЎСКІ.

НА 1930 ГОД

СЬПЯШАЙЦЕСЯ ПАДПІСАЦЦА

НА ГАЗЭТУ „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“

АБВЕСТКА.

ГАНДЛЁВА-БУДАЎНІЧАМУ ТРЭСТУ

патрабуецца для крэйдавапнянага заводу ў Койданаве:
майстар па абпальваньню вапны—1 чал.;
пальшчыкаў па абпальваньню вапны—3 чал.;
садчык-укладчык—1 чал.

УМОВЫ—ПА ЗГОДЗЕ.

«Торгстрой».

КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ АБ ЗГУБЕ ДАКУМЭНТАЎ 35 КАПЕЕК

Нарсуд Лядкянскага раёну, Аршанскай акругі, на падставе прысуду ад 17 кастрычніка 1929 г. і арт. 213 кр. код. за нядбайныя адносіны аб'вяшчае грамадзкае ганьбаваньне селяніну вёскі Пуцаціна, Слатоўскага с савету, Лядкянскага раёну Макулькіну Андрэю Арыстархаву.

Пастановай нарсуду 3 вуч. г. Гомелю ад 13-ХІ-29 г. гр-н г. Гомелю Жудро Хрысанф Міхасёў, 41 год, па арт. 196 К. К. з санкцыяй 213 арт. К. К. за несваечасовае выкананьне службовай тэлеграмы аб адпраўцы хлебных шчытоў у часе хлебазагатовак, прысуджаны да ганьбаваньня праз друк і агульны сход.

Нарсуд Бярэзінскага р-ну, Менскай акр. на падставе прысуду суда ад 17 кастрычніка 1929 г. і арт. 196 і 213 К. К. за выдачу пазык не па назначэньню, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне старшыні Багушэвіцкага с.-г. т-ва Забаронку Прохару Цітаву.

У Гомельскі акр. ЗАГС паступіла заява ад гр. Казла Рыгора Янкава аб зьмене прозьвішча яму і яго жонцы Палашцы з прозьвішча Казла на прозьвішча Кедраў.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Вучотна-конская кніжка Паўленка К. С., выд. Рэчыцкім РВК, кв. 152п.

— Квіт. за № 960 на здачу на хаваньне аблігац. у Рэчыцк. ашчадн. касы на імя Старасьценка А. Б., кв. 152п.

— Сяброўскі білет за № 96 саюзу харчавікоў, 2) Справка Рэчыцкага ЦРК, 3) Кніжка на атрыманьне дапамогі на беспрацоўі на імя Трыдынскага І. І., кв. 152п.

— Сяброўскі білет № 70348 Клешчанка Ф. Т., выд. саюз. Прац. зямлі і лесу, кв 152п.

— Бюлетэнь за № 104601 Аліпанскага Ш. І., выд. Рэчыцк. фабр. амбулятор., кв. 152п.

— Мэтрычн. выпісь нарадж. 1912 г. Фарбера Я., выд. Мазырск. акрвыканкомам, кв. 153 п.

— Вайсковая кніжка № 49 нарадж. 1903 Каваленка, выд. Карасьценскім Ваенкамат., кв. 154п.

— Рэгістрац. квіт. дома Эльнінда Г., выд. Барысаўск. камгасам, кв. 155п.

— Вучотна-конская карт. № 374 Шэцка Н., выд. Караліпскім РВК, кв. 156п.

— Чырвонаарм. кніжка, выд. Чэрвенскім вайсковым сталом, 2) Каапэрац. кніжка, выд. Чэрвенскім вайсковым сталом, 4) Вучотна-конская карт., выд. Чэрвенскім вайсковым сталом, 4) Страхавы ліст, дзьве аблігац. сялянскай пазыкі на імя Пяхота І. В., кв. 157п.

— Чырвонаарм. кніжка Грыбко Д. І., выд. 5 стр. палком, кв. 158п.

— Сяброўская кніжка Лапоніка І., выд Гомельск. акр. аддз. саюзу с.-гасп. і лясных рабочых, кв. 159п.

— Бальнічн. лісток Офенгейдзен Г. І., выд. Рэчыцк. гарадз. амбулятор., кв. 152п.